НАДЫХОДЗІЦЬ ПЕРШЫ ТЭРМІН ЦЕРАБЛЕНЬНЯ ІЛЬНУ

Пралетары ўсіх краёў, злучайцеся!

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК і Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі.

Год выдання—XV
№ 202 4107)
АЎТОРАК 28 ліпеня
1931 г.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАЛЫННА.

КАЛГАСЦЭНТР НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЎ НАЛЕЖНАЙ ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЎБОРКІ І ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ У КАЛГАСАХ. ПЛЯН ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ ВЫКАНАНЫ НА 12 проц. ЗАМЕСТ 400 ПАБУДАВАНЫ ТОЛЬКІ 33 МЯЛЬНА-СУШЫЛЬНЫЯ ПУНКТЫ

Арганізаваць брыгады церабіяльшчыкаў, прымацаваць машыны і цягавую сілу да вучасткаў, устанавіўшы ўдарныя нормы выпрацоўкі. Не чакаючы завозу машын, мабілізаваць усе сілы і сродкі—прыступіць да ўборкі ільну

ПА-БАЛЬШАВІЦКУ УБРАЦЬ УРАДЖАЙ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ

Вырашэньне праблемы тэхкультур —адна з важнейшых гаспадарча-палітычных задач.

Пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі ў другую бальшавіцкую вясну мы дабіліся новых перамог у справе сацыялістычнай рэканструкцыі сельскай гаспадаркі. БССР пакрываецца сеткай спэцыялізаваных саўгасаў і калгасаў, арганізуюцца новыя МТС. Усе гэтыя ўмовы даюць магчымасьць пераможна ісьці па шляху да вырашэньня праблемы тэхкультур у найкарацейшы тэрмін.

Пасеўная плошчаў БССР пад ільном у гэтым годзе **ПАШЫРАНА** з 127.000 га да 242.000 га, пад канаплямі з 21.000 да 40.000 га. Пасьпяховае завяршэньне сяўбы тэхкультур ставіць перад намі адказьнейшую задачу — **сваячасова і поўнасьцю ўбраць ураджай ільну і канапель.**

Усе работы па ўборцы ўраджаю тэхкультур павінны праводзіцца на аснове зьдзельшчыны, ацэненай у працадніёх.

ПРАВІЛЬНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ПРАЦЫ на аснове зьдзельшчыны з улікам у працадніёх — **ВЫРАШАЕ** посьпех уборкі тэхнічных культур.

БРЫГАДЫ ІЛЬНАЦЕРАБІЛЬШЧЫКАЎ зьяўляюцца асноўнай формай арганізацыі працы на ільнаўборцы.

ПРЫМАЦАВАНЬНЕ брыгад, інжэнтару, машын і цягавай сілы да вызначаных вучасткаў з поўнымі заданьнямі і цьвёрдымі тэрмінамі сканчэньня работ — **АБАВЯЗКОВАЯ ЗАДАЧА** кожнага калгасу.

Трэба канчаткова **ЛІКВІДАВАЦЬ АБЯЗЬЛІЧКУ І ПРЫМАЦАВАЦЬ БРЫГАДЫ** да поўных вучасткаў.

У сувязі з позьняй вясной і марудным пераходам калгасаў на зьдзельшчыну, большая частка пасеву ільну праведзена адначасова ў адзін тэрмін. Таму дён адначасова сьпее на вялікіх вучастках. Гэта акалічнасьць патрабуе ад усіх партыйна-савецкіх і калгасна-зямельных арганізацый выразнага апэрацыйнага кіраўніцтва ўборачнымі работамі, і, у першую чаргу, забесьпячэньня належнай падрыхтоўкі па лініі арганізацыі і расстаноўкі рабочай сілы.

Нельга дапусьціць ніякага ігнараваньня індывідуальнага сэктару. **Недаацэнка работы сярод аднаасобных бядняцка-серадняцкіх мас на руку кулаку і апартуністу.** Кулак будзе імкнуцца сарваць уборку ільну ў калгасах і, асабліва, у аднаасобным сэктары. Кулак і яго права-«лявацкая» агентура павінны атрымаць самы руйнуючы і бязьлітасны адпор.

Раённыя арганізацыі абавязаны разгарнуць шырокую масавую работу сярод калгаснікаў і аднаасобнікаў, мабілізаваць іх увагу вакол задач сваячасовай уборкі і апрацоўкі ільну і канапель, забясьпечыўшы сваячасовую здачу дзяржаве закантрактаванай прадукцыі. Уборка павінна быць арганічна ўвязана з барацьбой за **ДАЛЕЙШАЕ НАРАСТАНЬНЕ** тэмпаў калектывізацыі.

ПАДРЫХТОЎКА ДА ПЕРШАПАЧАТКОВАЙ АПРАЦОЎКІ ІЛЬНУ І КАНАПЕЛЬ — ударная задача. Між тым, гэта работа праводзіцца зусім марудна. Будаўніцтва мяльна-сушыльных пунктаў праходзіць неданушчальна дрэнна. З вызначаных да пабудовы 400 ільняных і 80 няльковых пунктаў пабудаваны толькі **33** (у Слуцкім, Межанскім, Быхаўскім і Старобінскім раёнах).

Падрыхтоўка кадраў для ўборкі і апрацоўкі ільну таксама праходзіць зусім нездавальняюча. На сёнешні дзень замест 22.000 мачыльшчыкаў і сушыльшчыкаў падрыхтавана толькі 660 чал. Плян падрыхтоўкі кадраў выкапан усяго толькі на **12 проц.**

Падрыхтоўку кадраў, будаўніцтва пунктаў, рамонт старых сушылак, мялак і інш. машын, падрыхтоўку мачыльных ям трэба неадкладна з посьпехам **СКОНЧЫЦЬ.** Нізавыя арганізацыі павінны праявіць максымум энэргіі і ініцыятывы і наладзіць на месцах выраб ільна-малатарань «Эддзі». Бязьдзейнасьці ў рэалізацыі гэтых важнейшых мерапрыемстваў трэба пакласьці канец.

Ільнаводчыя саўгасы і МТС павінны ісьці ў авангардзе ўборачнай.

Нізавыя арганізацыі не павінны спадзявацца толькі на завоз машын для ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну. **ТРЭБА МАБІЛІЗАВАЦЬ** усе мясцовыя сілы і сродкі і забясьпечыць сваячасовую і поўную ўборку ільну і канапель, а таксама сваячасовую здачу прадукцыі дзяржаве.

МЫ СТАІМ НА ПАРОЗЕ ПАЧАТКУ ЎБОРКІ ІЛЬНУ. 6-га жніўня паўднёвыя раёны павінны прыступіць да церабленьня. Апошнія дні, якія засталіся, павінны быць максымальна выкарыстаны для ліквідацыі ўсіх недахопаў. Раённыя штабы і праверачныя камісіі асабліва ў ільнаводных калгасах абавязаны разгарнуць шырокую растлумачальную работу вакол задач уборкі ільну і канапель.

Даючы адпор кулаку і яго агентам —апартуністам, па-бальшавіцку пераманаючы труднасьці, будзем з яшчэ большай настойлівасьцю змагацца за вырашэньне праблем тэхкультур, будзем разгортваць далейшае будаўніцтва спэцыялізаваных таварных калектыўных гаспадарак.

ЛЁН І КАНОПЛІ ПАВІННЫ І БУДУЦЬ УБРАНЫ І АПРАЦАВАНЫ Ў ТЭРМІН.

Падрыхтоўка да ўборкі і апрацоўкі ільну на тормазах

Надыходзіць першы тэрмін церабленьня ільну. Між тым, мялюнак падрыхтаванасьці калгасаў, саўгасаў і цэнтральных устаноў да ўборкі ільну вельмі сумны.

На сёнешні дзень Трактарацэнтр атрымаў толькі 16 ільнацерабілак, прычым усе машыны прывозяцца бяз пасаў. Шклоўскі раён 17 ліпеня атрымаў ільнацерабілкі замест запасных частак для ільнацерабілак былі прысланы часткі для жнівярак. Ільнаканапляводтрэстам атрымана 35 ільнацерабілак замест плянавых 37. Астатнія дзьве павінны атрымацца на працягу апошніх дзён.

Пабудова 400 мяльна-сушыльных пунктаў па ільне і 30 па канаплях, якія павінны былі быць пабудаваны да 1-га жніўня, зусім пішчэ не распачаты.

У сувязі са зрывам пабудоў мяльна-сушыльных пунктаў, Калгасцэнтрам была дана дырэктыва аб прыстасаваньні старых ёвень, лазьняй, і інш. памяшканьняў для мяльна-сушыльных пунктаў. Але толькі 4 раёны—**СЛУЦКІ, МЕЖАНСКІ, БЫХАЎСКІ, СТАРОБІНСКІ,** прыступілі да прыстасаваньня старых будынкаў для мяльна-сушыльных пунктаў. Такіх пунктаў налічваецца ўсяго толькі 33. Астатнія раёны апартуністычна адносяцца да пабудовы пунктаў па першапачатковай апрацоўцы ільну і канапель і зусім яшчэ не прыступілі да пабудовы іх. Аб сьцепішчах, мачыльных ямах і інш. падрыхтоўчых работах Калгасцэнтр зусім нічога ня ведае.

Рабочая праграма толькі 26 ліпеня спушчана Калгасцэнтрам па раёнах у той час, як яна павінна была быць у кожным калгасе да 20-га ліпеня.

Да сёнешняга дня яшчэ ня зроблена ніводнай малатарні «Эддзі» ня гледзячы на тое, што пводла пастановы СНК БССР 800 малатарань павінны былі быць гатовы да 15 жніўня. Уся справа робіцца толькі на паперы. Да канкрэтнай пабудовы малатарань ня прыступлена.

Заданьне па пабудове 800 малатарань разьмеркавана Белкаапрамсаюзам па трох пунктах: БАБРУЙСКУ — 266, БЫХАВУ — 266, і МАГІЛЕВУ — 268, у якіх ужо прыступлена да выраву драўляных станін.

Заводы «КАМУНАР» (Менск) і «РУХАВІК РЭВАЛЮЦЫІ» (Гомель) павінны поўнасьцю забясьпечыць гэтыя пункты асямі і валікамі для малатарань «Эддзі». Між тым, для выпрацоўкі 1600 валікаў зусім не прыступлена, ня гледзячы на тое, што Белкаапрамсаюз для гэтай мэты мае 54 тоны асявода жалеза.

Толькі 16-га ліпеня Белкаапрамсаюз падпісаў умовы з заводам «Камунар» на выраб 3200 падшыпнікаў для машын «Эддзі» з тэрмінам здачы 60 проц. да 15-га жніўня, а 40 проц. да першага верасьня. На выраб асей і валікаў умовы яшчэ не заключаны.

У сваёй пастанове ад 4-га ліпеня НК РСІ прапанаваў Наркамзему БССР забясьпечыць усім неабходным жалезам Белкаапрамсаюз для пабудовы малатарань «Эддзі». Але да гэтага часу Наркамзем матар'ялямі не забясьпечвае.

Малатарань Цітава для абмалоту канапель няма ніводнай у той час, як паводле пляну намечана прывезьці 70. Таксама няма ніводнай мялкі 6-ці і 12-цівальных у той час, як па пляне павінны быць прывезены ў колькасьці 697 штук.

Ня лепшая справа і з падрыхтоўкай кадраў. Да ўборкі ільну і канапель павінна быць падрыхтавана спэцыялістаў 4997 чалавек, а падрыхтавана на 20 ліпеня толькі 580 чалавек, што складае 11,6 проц. пляну.

Зусім нездавальняюча праходзіць падрыхтоўка брыгадзіраў мачыльшчыкаў, сушыльшчыкаў і г. д. па ільне і канаплях. Замест 2200 чалавек падрыхтавана 660 брыгадзіраў. Толькі з 25-га ліпеня распачаліся міжраённыя двухтыднёвыя курсы на 540 чал. па падрыхтоўцы мачыльшчыкаў, сушыльшчыкаў і інш. спэцыяльнасьцяй па ільне і канаплях.

Такім ганебным адносінам да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну павінен быць пакладзен канец. Апартуністычныя разважаньні і спасыланьні на «аб'ектыўныя прычыны» па будаўніцтве мяльна-сушыльных пунктаў павінны быць зломпены.

Убраць з дарогі ганебныя чарапашыя тэмпы па падрыхтоўцы да ўборкі першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель.

А. КІР.

Увесьці зьдзельшчыну ў нова-арганізаваных калгасах

У падрыхтоўцы да ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну па былым Круглянскім раёне маюць месца значныя посьпехі. Планы работ і арыентовачныя нормы выпрацоўкі даведзены да кожнага калгасу і саўгасу. Многія калгасы даюць сустрачныя павялічаныя нормы выпрацоўкі па ўборцы і апрацоўцы ільну. У большасьці калгасаў ужо закончана адведзеньне сьцепішч. Значная работа праведзена ў галіне падрыхтоўкі ільнаводчых кадраў. У чэрвені месяцы закончылі сваю працу 2-тыднёвыя курсы ільнаводаў, праз якія прапушчана звыш 50 калгасных брыгадзіраў.

Праверка выкананьня пасеву ільну па кантрактацыйных дагаворах выявіла ў калгасах неравыкананьне плянаў на 9 проц., на якія зроблена дадатковая кантрактацыя. Прэміі за пашырэньне плошчы пад засевы ільну разьмеркованы і частка іх выдана ўжо калгаснікам на рукі.

Разам з гэтым, па раёне ў справе падрыхтоўкі да ўборкі і апрацоўкі ільну мае месца і рад прарываў. Зусім недапушчальна праходзіць па калгасах расстаноўка сіл і арганізацыя брыгад. В 124 калгасаў, толькі ў 98 давялі плян уборкі і апрацоўкі ільну да паасобных брыгад і калгаснікаў. У калгасах, якія арганізаваны вясной бягучага году, не ўведзена зьдзельшчына. Адным з найбольшых недахопаў зьяўляецца тое, што ў раёне недаацэнена роля дзіцячых ясель і плюцовак. У 124 калгасах арганізавана толькі 43 ясель, што бязумоўна, не дасьць магчымасьці поўнасьцю скарыстаць жаночую рабочую сілу, якая адыгрывае рашаючую ролю ў правядзеньні ўборкі і апрацоўкі ільну.

Райкалгасаюз Талачынскага раёну, дзе якога далучаецца Круглянскі раён пасьля ліквідацыі, павінен неадкладна прыняць усе захады, каб гэтыя недахопы былі зьнішчаны.

К.

Рыхтавацца да засеву азіміны

Пастанова Народнага Камісарыяту Земляробства БССР аб тэрмінах пасеву азімых расьлін

У разьвіцьцё пастановы Савету Народных Камісараў БССР аб уборачнай і асеньняй пасеўнай кампаніі і, выходзячы з неабходнасьці пасьпяховага праведзеньня сяўбы зімовых расьлін увосень 1931 г., калегія Наркамзему ПАСТАНАЎЛЯЕ:

1. Устанавіць тэрміны пасеву зімовых расьлін увосень 1931 г. для раёнаў: а) Асьвейскага, Расонскага, Полацкага, Вушацкага, Лепельскага, Сіроцінскага, Сураскага, Віцебскага, Гарадоцкага, Бешанковіцкага, Лёзьненскага, Чашніцкага, Сеньненскага, Аршанскага, Дубровенскага, Дрысенскага — з 15 жніўня да 25 жніўня.

б) Талачынскага, Горацкага, Крупскага, Бягомльскага, Плешчаніцкага, Барысаўскага, Лагойскага, Смалявіцкага, Заслаўскага, Койданаўскага, Менскага, Шклоўскага, Мсьціслаўскага, Пухавіцкага, Бярэзінскага, Вузьдзенскага, Капыльскага, Асіпавіцкага, Клічаўскага, Быхаўскага, Магілеўскага, Прапойскага, Чаўускага, Чэрыкаўскага, Крычаўскага, Клімавіцкага, Касьцюковіцкага, Чэрвеньскага, Бялынічскага, Кармянскага і Чырвонапольскага — з 20 жніўня па 1 верасьня.

в) Бабруйскага, Стара-дарожскага, Слуцкага, Чырвона-Слабодзкага, Старобінскага, Любаньскага, Глускага, Рагачоўскага, Парыцкага, Жлобінскага, Мазырскага, Чачэрскага, Буда-Кашалёўскага, Уваравіцкага, Веткаўскага, Рэчыцкага, Гомельскага, Цэрахаўскага, Хойніцкага, Лоеўскага, Камарынскага, Нараўлянскага, Ельскага, Лельчыцкага, Тураўскага, Жыткавіцкага, Пятрыкоўскага і Брагінскага — з 25 жніўня па 5 верасьня.

УВАГА: Ва ўсіх пералічаных раёнах дапусьціць адтэрмінаваньне сканчэньня пасеву зімовых расьлін на занятых папарах на 10 дзён супроць устаноўленых тэрмінаў.

2. Абавязаць цэнтральныя сельскагаспадарчыя і калгасна-каапэрацыйныя сыстэмы і райза павесьці шырокую растлумачальную працу сярод рабочых саўгасаў, калгаснікаў і бядняцка-серадняцкіх мас насельніцтва за поўнае выкананьне плянаў сяўбы ва ўстаноўленыя тэрміны, ужываючы сацыялістычныя мэтады арганізацыі працы — ударніцтва, сацспаборніцтва і ўзяцьце на грамадзкі буксір адстаючых з абавязковым увядзеньнем зьдзельшчыны.

НАРКОМ ЗЯМЛЯРОБСТВА БССР
МАСЮКОЎ

Менскі гарпрафсавет заклікае ўзмацніць працоўную дапамогу прыгарадным гаспадаркам

Да ўсіх прафарганізацый і членаў прафсаюзаў г. Менску

Рабочыя і служачыя гораду Менску на чале са сваімі прафарганізацыямі за час веснавой сяўбы і праполкі паказалі гэрайчныя ўзоры брацкай працоўнай дапамогі прыгарадным саўгасам і калгасам.

З няпоўных вестак, якія ёсьць у гарпрафсавеце, да 18 ліпеня адпрацавана 56.000 працадзён. Але-ж побач з гэтымі посьпехамі неабходна адзначыць, што за апошнюю дэкаду гэта працоўная дапамога значна аслабла.

НАШЫ САЦЫЯЛІСТЫЧНЫЯ ПАЛІ АСАБЛІВА Ў ГЭТУ І НАСТУПНЫЯ 2 ДЭКАДЫ БОЛЬШ ЧЫМ КАЛІ ПАТРАБУЮЦЬ ДАПАМОГІ.

Поўнасьцю пасьпела 2-я праполка і ў гэты самы час — уборка ранніх культур (бульба, ягады, гуркі і г. д.).

ФАБКОМЫ, ЗАЎКОМЫ, РАБАЧКОМЫ, МЯСЦКОМЫ І ЎСЕ РАБОЧЫЯ І СЛУЖАЧЫЯ!

Неабходна зараз-жа перавесьці работу па працоўнай дапамозе прыгарадным гспадаркам на ўдарныя баявыя рэйкі. Поўнасьцю выканаць узятыя на сябе абавязкі па ўмовах аб дапамозе. Сваячасовая добраякасная праполка і ўборка вырашае пытаньне забесьпячэньня рабочых і служачых гораду прадуктамі гародніны і садавіны на цэлы год.

За работу, таварышы, за выкананьне сваіх абавязкаў па дапамозе сацыялістычным палём!

Прэзыдыум гарпрафсавету чакае адказу на гэты зварот штодзённым масавым выхадам у поле, узмацненьнем арганізацыйна-масавай працы шэфствуючых прадпрыемстваў і ўстаноўнад саўгасамі і калгасамі, правільнай арганізацыяй працы, сапраўдным пераводам на зьдзельшчыну, максымальным скарыстаньнем сельсна-гаспадарчых машын, ліквідаваньнем абязьлічкі, разгортваньнем сацспаборніцтва і ўдарніцтва.

Гарпрафсавет катэгарычна патрабуе ад кіраўнікоў саўгасаў правільнай арганізацыі праполкі і ўборкі, поўнасьцю скарыстаўшы усе ўласныя магчымасьці і рацыянальна скарыстаўшы рабочую дапамогу гораду.

ПРЭЗЫДЫУМ МЕНГАРПРАФСАВЕТУ.

Як праходзіць падрыхтоўка да ўборкі ільну і канапель

По гэтым пытаньні «Зьвязда» склікае НАРАДУ

СЕНЬНЯ, 28 ліпеня ў памяшканьні рэдакцыі (габінэт рэдактара) роўна ў 13 гадзін.

ВЫКЛІКАЮЦЦА АДКАЗНЫЯ ПРАДСТАЎНІКІ: НКЗ БССР, Белкалгасцэнтру, ЦСПСБ, Белкаапсаюзу, Наркамснабу, Ільнаканапляводтрэсту, Ільнаканапляводбуду, Ільнапянькаапрацоўкі, Белпільнасаюзу, Белсельснабу, Саюзхлеба, Трактарацэнтру, Саўгастрэсту, Наркампрацы і зацікаўленых ЦП прафсаюзаў.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Інфармацыя прадстаўніка Галоўленкому СССР.

2) Даклад нам. наркамзема тав. Паніматкі аб ходзе падрыхтоўкі да ўборкі ільну і канапель і рэалізацыі ўрэджаю тэхкультур.

3) Судаклады арганізацый, прадстаўнікі якіх выклікаюцца на нараду.

РЭДАКЦЫЯ ГАЗЭТЫ «ЗЬВЯЗДА».

Раёны ўключаюцца ў праверку

СЕННО (па тэл.). Раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі разгортваньня ўборачнай кампаніі і падрыхтоўкі да асеньняй сяўбы. Арганізаваны райштаб. Мабілізавана 32 асобы з раённага, партыйна-камсамольскага актыву, якія выехалі ў сельсаветы.

***

ГОМЕЛЬ (па тэл.). Гомельскі раён уключыўся ў месячнік агляду разгортваньня ўборкі падрыхтаванасьці да асеньняй сяўбы. Створаны штаб з 30 асоб. пад старшынствам сакратара гаркому тав. Хлеўніннава. Па сельсаветах разасланы адказныя работнікі гаркому.

***

ЧЫРВОНАЯ СЛАБАДА (па тэл.). Раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі. Створаны райштаб, які мабілізаваў партыйна-камсамольскі і прафэсыянальны актыў і накіраваў яго ў саўгасы і калгасы.

***

СЛУЦАК. Раённа-партыйная арганізацыя ўключылася ў месячнік генэральнай праверкі разгортваньня ўборачнай кампаніі. Раённая нарада сакратароў парт'ячэек сумесна з партактывам распрацавала рад мерапрыемстваў па правядзеньні ўборкі ўраджаю.

Мабілізавана 75 чалавек партактыву, якія 22 ліпеня выехалі ў сельсаветы. Раённая газэта «ЛЕНІНСКІ ШЛЯХ» арганізавала 7 брыгад па праверцы падрыхтоўкі на мясцох. Раённай газэтай арганізоўваецца 15 насьценных газэт у калгасах і шматтыражка ў МТС.

Пастаноўлена мабілізаваць 50 рахункаводаў для наладжваньня ўліку працы і ўкараненьня зьдзельшчыны ў калгасах.

***

ПРАПОЙСК. (Па тэлегр.). Раён уключыўся ў месячнік праверкі. Складзен штаб. Мабілізаваны партыйны, камсамольскі і прафэсыянальны актыў і накіраван у сельсаветы.

***

ЧЭРЫКАЎ. (Па тэлеграфу). Чэрыкаўскі раён уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі падрыхтоўкі да ўборкі ўраджаю. Арганізован райштаб. У сельсаветы накіравана 17 адказных раённых работнікаў.

***

ТУРАЎ. (Па тэлеграфу). Тураўскі раён уключыўся ў месячнік праверкі. Створан райштаб, праведзена нарада партактыву, які накіраван у сельскія саветы.

***

ЖЛОБІН. (Па тэлеграфу). Жлобінскі раён уключыўся ў месячнік праверкі. 24 ліпеня створан штаб. У сельсаветы накіравана 25 адказных раённых работнікаў.

НА МЁРТВЫМ ПУНКЦЕ

МАЗЫР. (Наш кар.).

Падрыхтоўка да збожжазагатоўчай кампаніі ідзе недапушчальна дрэнна. Саюзхлеб і райкаапсаюз бязьдзейнічаюць. З 6 складаў райкаапсаюзу два патрабуюць рамонту, аднак, да апошняга паваг ня прыступлена. Растлумачальная работа сярод калгаснікаў і бядняцка - серадняцкай часткі вёскі не праводзіцца.

Загатоўчы апарат не ўкамплектаваны поўнасьцю. Прыёмшчыкаў на складах няма, уся работа ўзвальваецца выключна на загадчыкаў складамі.

Пры сельсаветах загатуль яшчэ ня складзены камісіі садзейнасьці збожжазагатоўкам.

ЮШКЕВІЧ.

РЭЙД БРЫГАД „ЗЬВЯЗДЫ" НА ІЛЬНАЗАВОДАХ

Сваячасовае заключэньне дагавароў з калгасамі—

асноўны сродак спыненьня цякучасьці рабочай сілы на ільназаводах

ВУЛА. (Брыгада «Зьвязды»). Будаўніцтва Вульскага ільназаводу праходзіць сахарэкам і таму — марудным тэмпамі. Адсутнасьць належнага тэхкіраўніцтва пабудовай зьяўляецца асноўнай прычынай гэтакіх тэмпаў. Дзякуючы галавацяскаму складаньню праектаў і чарцяжоў, дзякуючы неахайным адносінам да сваёй работы тэхніка пабудовы Быхаўца, за параўнаўча кароткі час будаўніцтва даводзілася па некалькі раз перарабляць пачатыя работы.

На будаўніцтве адчуваецца недахват кваліфікаванай рабочай сілы, а ў гэты-ж час некаторыя рабочыя, у прыватнасьці курсанты ЦПГу робяць вялікія прастоі з прычыны недахвату інструмэнтаў і матар'ялу. Між тым, адміністрацыя заводу ня робіць ніякіх захадаў, каб ліквідаваць гэтыя недахопы.

Партыйныя і прафэсыянальныя арганізацыі заводу не праводзяць ніякай масавай работы. Сацспаборніцтва і ўдарніцтва не разгорнута, прэміяльныя фонды не скарыстоўваюцца. Кіраўнікі заводу зусім не разумеюць новых форм і мэтадаў работы і кіраўніцтва.

Такая «мудрая» палітыка кіраўнікоў Вульскага ільназаводу прывяла да зьнижэньня працоўнай дысцыпліны (працы складаюць 16 проц. агульнай колькасьці чалавекадзён) і павялічвала цякучасьць рабочай сілы. Так, з 50 рабочых, што былі на будаўніцтве, на 16 ліпеня засталося толькі 24. Усё гэта ставіць будаўніцтва заводу ў пагрозу.

Кіраўніцтва заводу павінна рашуча перабудаваць усю сваю работу ў адпаведнасьці з новымі задачамі данага этапу сацыялістычнага будаўніцтва. Скарыстаньне ўнутраных рэсурсаў, ліквідацыя абязьлічкі, увядзеньне гаспадарчага разрахунку, зьдзельшчыны і прэміяльнай сыстэмы, шырокае разгортваньне сацспаборніцтва і ўдарніцтва — асноўныя ўмовы сваячасовага заканчэньня ільназаводу.

Брыгада «Зьвязды»:
САНЦЭВІЧ, ДАРАШКЕВІЧ.



Шаха Багушэўскага ільназаводу.

Завод першай чаргі без тэхнагляду

Будаўніцтва Багушэўскага ільназаводу мясцовымі будаўнічымі матар'ялямі, як каменьнем, цеглаю і лесам, было забясьпечана ў выстарчальнай колькасьці. Між тым, на сёнешні дзень будаўніцтва галоўнага корпусу быканана толькі ў разьмеры 15 проц., складзкіх памяшканьняў — на 65 проц. і дапаможных памяшканьняў—на 95 проц.

З прычыны недахвату цьвікоў, скабянога жалеза і балтоў, будаўніцтва было часова спынена. Загадчык пабудовы тав. Годас не правяў у гэты час належнай ініцыятывы, каб замяніць адзін матар'ял другім. Напрыклад, калі палоснае жалеза адсутнічала, з вучастку на будаўніцтва прыбыла палоснае жалеза, з якога можна было зрабіць 300 скоб. Але Годас пачаў разважаць, што з такою малою колькасьцю жалеза ня варта рабіць скобы і што наогул яно няпрыгоднае. Начальнік Віцебскага будаўнічага вучастку Разэнблюм за ўвесь час на будаўніцтве быў толькі адзін раз, а тэхнік нават ні разу. Загадчык заводу сам не разабраўся як сьлед з чарцяжамі і дапусьціў некаторыя тэхнічныя памылкі. Па нядбайнасьці загадчыка вучастку Разэнблюма будаўніцтва Багушэўскага заводу было пакінута бяз вапны. Таму фундамант рабіці на адным цэмэнтным растворы пры вострым недахваце цэмэнту. У выніку на ўвесь фундамант не хапіла цэмэнту.

Белільнаканапляводу правяў нядбайныя адносіны да складаньня каштарысаў, у якіх цэны на будаўнічыя матар'ялы былі паказаны ў некалькі раз меншым, чым у сапраўднасьці. Гэта тармазіла фінансаваньне будаўніцтва і адбілася на тэмпах работ

Рабочыя і тэхнічна - адміністрацыйны персанал на тэхнічнай нарадзе абвясьцілі сябе ударнікамі і абавязаліся скончыць пабудову ў тэрмін.

Зараз на завод накіравана 14 скрынак цьвікоў і скабяное жалеза.

Прыняты меры да паляпшэньня харчаваньня рабочых, занятых на пабудове.

Брыгада «Зьвязды»:
МАЗАЛЕЎСКІ І МАЗАІН.

РАСПАЧАЛАСЯ УБОРКА АЗІМІНЫ

ЖЛОБІН, 19/VII. (БЕЛТА). Пачалася ўборка азіміны. За два дні ў Кабанаўскім сельсавеце зжата 230 гэктараў і ў В.-Албянскім — 69 гэктараў. Уся работа праводзіцца на аснове зьдзельшчыны.

Уборку азімых праводзяць калектыўна

МСЬЦІСЛАЎЛЬ. Калгасы Хадасоўскага сельсавету «Чырвоная Дуброва», «Суп» і імя Галадзеда скончылі сенаўборку. Прыступілі да жніва; уборку азімых праводзяць калектыўна.

Іншыя калгасы канчаюць сенаўборку.

Увесь Хадасоўскі сельсавет уключыўся ў месячнік генэральнай праверкі. Створан штаб. Мабілізавана 18 асоб сельскага актыву на ўвесь час уборачнай кампаніі і асеньняй сяўбы.

Сельштаб Логінаў.

***

НАСОВІЧЫ. (Па тэлеграфу). Саўгас «Насовічы» скончыў уборку сена і азімага збожжа. Пачалася малацьба. Падрыхтавана пад асеньні пасеў 25 проц. папару.

Дырэкцыя, партком і рабачком.

Першы чырвоны абоз з жытам

БУДА - КАШАЛЁВА. Уборка сенажаці, жыта і ячменю па калгасах раёну праходзіць з посьпехам. Перадавыя калгасы «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» і «ТРАКТАРЫСТ» прыступілі да абмалоту новага ўраджаю.

Калгас «ЧЫРВОНАЯ БЕЛАРУСЬ» у першы дзень абмалаціў 370 пудоў збожжа і здаў чырвоным абозам у наапэрацыю. Да малацьбы прыступіў саўгас «Рагінь».

РАЙШТАБ.

100 га сенажаці ня скошана

КОЙДАНАВА. Калгас імя СНК БССР зьяўляецца буйнейшым калгасам у раёне, які налічвае 300 гаспадарак, але арганізацыя і ўлік працы ў ім не наладжаны. Наперакор калгаснікам, праўленьне калгасу супраціўляецца ўвядзеньню зьдзельшчыны і цьвёрдых норм выпрацовак.

Цэлых 10 дзён у калгасе працавалі раённыя работнікі па ўкараненьні зьдзельшчыны. Праўленьне-ж калгасу раздало калгаснікам працоўныя кніжкі з незапісанымі працаднямі.

Працдысцыпліна ў калгасе адсутнічае. На сенаўборку штодзённа ня выходзіць каля аднай трэцяй часткі ўсёй працоўнай сілы калгасу. 100 гэкт. сенажаці стаяць нескошанымі.

Патрэбна ўдарыць па апартуністах, якія супраціўляюцца ўвядзеньню зьдзельшчыны і гэтым самым дапамагаюць клясаваму ворагу.

БРЫГАДЗІР.

З фронту ўборачнай

Першы ўраджай апраўдаў затраты на мэліярацыю

БАБРУЙСК. Улетку 1928 году Туголіцкае мэліярацыйнае таварыства, Каменскага сельсавету, прыступіла да мэліярацыі. Было асушана балота 4-х вёсак.

Закладзены дасьледчы вучастак у в. Брошка-Таканаўцы з засевам вікі і аўса даў добрыя вынікі.

Ужо другі год сяляне косяць траву з аўсом, канюшынай і іншымі культурнымі травамі.

Ураджай першага году апраўдаў усе затраты на мэліярацыю.

Па прыкладзе брошка-таканаўцаў і іншыя вёскі ўзяліся за мэліярацыю балот (в. в. Пятровічы, Мачулкі і інш.).

Ул. Новік.

Заканчваецца ўборка жыта

МАЗЫР. (Наш кар.).

У выніку добрай арганізацыі працы па прынцыпах зьдзельшчыны камуна «АВАНГАРД» скончыла ўборку сена і на сёнешні дзень УБРАЛА ЎЖО 80 ПРОЦ. ПЛОШЧЫ, ЗАСЕЯНАЙ ЖЫТАМ.

У першых радох змагароў за ўдарную ўборку ўраджаю знаходзіцца калгас «НОВЫЯ ХАЛАДНІКІ». У гэтым калгасе скошана 280 гэктар сенажаці. Засталося ўбраць яшчэ 7 гэктары. Адначасова ідзе і ўборка жыта. На 20 ліпеня было УБРАНА 60 ПРОЦ. УСЯГО ЖЫТА.

ЯК КАЛГАС «АВАНГАРД», ТАК І «НОВЫЯ ХАЛАДНІКІ» СКОНЧАЦЬ УБОРКУ ЖЫТА Ў БЛІЖЭЙШЫЯ ДНІ.

Бальшавіцкія тэмпы ўборкі далі новы прыліў

СЛУЦАК. Большасьць калгасаў Слуцчыны ў асноўным скончылі ўборку нюшыны і сенажаці.

Першымі скончылі гэту работу калгасы «Прамень камуны» і «Новае жыцьцё». Яны выйшлі пераможцамі на фронце сенаўборкі, дзякуючы шырокаму разгортванню сацыялістычных мэтадаў працы—сацспаборніцтва і ўдарніцтва і сапраўднаму ўкараненьню зьдзельшчыны.

Калгаснікі арцелі «Прамень камуны» ў сваёй рабоце паказалі сапраўдны ўзоры бальшавіцкай работы, перавыконваючы нормы выпрацоўкі на 25-30 проц.

У калгасе «Новае жыцьцё» за часьбы зьвезена ў гумны звыш 5 тысяч пудоў канюшыны і 3 тыс. пудоў сена. Нават старыя паказалі ўзоры гэрайзм таксама перавыконваючы нормы выпрацоўкі.

Бальшавіцкія тэмпы ўборкі сенажаці паказалі і калгасы імя Ягорава, Сталіна і «Бальшавіцкая зорка»—Урэцкага сельсавету.

Бальшавіцкія тэмпы ўборкі сена выклікалі новы прыліў у калгасы. За апошнюю дэкаду па Урэцкім сельсавеце ў калгасы ўліпося 46 новых гаспадарак. Процант калектывізацыі ўзрос з 26 да 34. У калгас «Прамень камуны» за час уборкі ўліпося 15 новых гаспадарак.

КАНОНЧЫК ЯНКА.

З-за галавацяпаў гіне насеньне і стаяць трактары

РЭЧЫЦА. У 1930 годзе балотная гаспадарка «Рэчыца» пачала падрыхтоўчыя работы да эксплёатацыі балотнага масыву на плошчы ў 992 гэкт.

Да гэтага часу гідра-тэхнічныя работы на большай частцы балота скончаны. На плошчы ў 500 гэкт. праведзены падрыхтоўчыя і культурна-тэхнічныя работы.

Паводле пляну гэтага году трэбна было засеяць на гэтым балоце 400 гэктараў вікай і балотнымі травамі, але на сёнешні дзень ніводнага гэктара яшчэ ня ўзорана. Гаспадарцы павінны былі завезьці 9 сенічных трактараў і адпаведную колькасьць прычэпных прыладаў. Замест гэта на балота прывезьлі 7 калёсных трактараў сыстэмы «Інтэрнацыянал», якія няпрыгодны для ворыва на балоце.

Аб гэтым дырэкцыя гаспадаркі паведаміла белкантору Саюзпрамкорму, і апошняя ўжо тры тыдні маў

МАШЫНЫ—УБОРАЧНАЙ

НІ КРОКУ НАЗАД

ГОМСЕЛЬМАШ НА ШЛЯХУ ДА ПЕРАЛОМУ

КРУТА УЗНЯЦЬ ТЭМПЫ ВЫПУСКУ СЯЧКАРАНЬ

Бюро калектыву Гомсельмашу ўхваліла работу брыгады „Зьвязды"

ГОМСЕЛЬМАШ, 25 ЛІПЕНЯ.

ВЫПУСК АСНОЎНЫХ МАШЫН ЗА ПЯТУЮ ПЯЦІДНЕЎКУ ПАКАЗВАЕ, ШТО ГОМСЕЛЬМАШ ЗАВАЁЎВАЕ ПЕРАЛОМ І БЯРЭ ЎЖО ПЕРШЫЯ ВЫШЫНІ. ПРАПРАЦОЎКА АРТЫКУЛУ ТАВ. СТАЛІНА, РАД МЕРАПРЫЕМСТВАЎ, ПРАВЕДЗЕНЫХ У ЖЫЦЬЦЕ ДЗЯКУЮЧЫ ВЫТВОРЧЫМ МІЖЦЭХАВЫМ НАРАДАМ, ВЫТВОРЧАЙ НАРАДЗЕ ІТР І АСАБЛІВА АПОШНЯЙ НАРАДЗЕ АДМІНІСТРАЦЫЙНА-ТЭХНІЧНАГА І ІНЖЫНЭРНАГА ПЭРСАНАЛУ, ЯКАЯ АДБЫЛАСЯ 15 ЛІПЕНЯ, ДЗЕ ЗАД ЖОРСТКУЮ ПЭРСАНАЛЬНУЮ АДКАЗНАСЬЦЬ БЫЛІ ДАНЫ ЗАДАНЬНІ І ТЭРМІНЫ НА АЖЫЦЦЯЎЛЕНЬНЕ ІХ — ПАСТУПОВА ВЫВОДЗЯЦЬ ГОМСЕЛЬМАШ З ЗАЧАРАВАНАГА КОЛА НЕПАЛАДКАЎ, САМАЦЕКУ І ЛЯДБАЙНАСЬЦІ. РАБОЧЫ КАЛЕКТЫЎ СЕЛЬМАШУ, БРЫГАДЫ І АСОБНЫЯ ТАВАРЫШЫ ГЭРАІЧНА БЮЦЦА ЗА ЖОНЫ КРОК ДА ЗАБАЯВАНЬНЯ ПРАМФІНПЛЯНУ І ДА ЯГО ВЫКАНАНЬНЕ

Сакратар парткалектыву Гомсельмашу тав. ГЕНКІН.

ПАКАЗАЛЬНІКІ АПОШНЯЙ ПЯЦІДНЕЎКІ, УПЯРШЫНЮ ЗА ГЭТЫ ГОД, ТАК ПАСТУПОВА ПАДВОДЗЯЦЬ ГОМСЕЛЬМАШ ДА ПЛЯНАВАГА ЗАДАНЬНЯ.

СІЛАСАРЭЗАК ВЫПУШЧАНА 21 ЛІПЕНЯ—23, 22-га—29, 23-га—30, 24-га 19, 25-га—30. СЯЧКАРАНЬ: 21-га—1, 22-га—4, 23-га—3, 24-га—5, 25-га—6. У ЗАПУШЧАНЫМ СТАНЕ ЯШЧЭ ЗНАХОДЗЯЦЦА БУЛЬБАСАРТОЎКІ І БУЛЬБАМЫЙКІ. ГЭТЫЯ МАШЫНЫ ВЫРАБАЮЦЦА, АЛЕ НЯ МОГУЦЬ БЫЦЬ ДАКОНЧАНЫ З ПРЫЧЫНЫ НЯЎПРАЎНІ ЭЛЕКТРАЗВАРАЧНАГА АПАРАТУ І АДСУТНАСЬЦІ КІСЛАРОДУ ДЛЯ АЦЭТАГЕНУ.

АДНАК, БОЛЬШ ПОЎНАЯ І СВАЯЧАСОВАЯ ПАДАЧА ДЭТАЛЯЎ З МЭХАНІЧНАГА—НЯ МОЖА БЫЦЬ КАНКРЭТНАВЫМ ДАСЯГНЕНЬНЕМ. У ДЭТАЛЯХ ЯШЧЭ ЕСЬЦЬ ШМАТ НЕДАДЗІЛАДНАСЬЦЯЎ, АСАБЛІВА НА ПРАЦЭСЕ СЬВІДРОЎКІ. НА ЗНІЧЭНЬНЕ ГЭТЫХ НЕДАХОПАЎ І НА ВЫКАНАНЬНЕ ЯШЧЭ НЕ АЖЫЦЬЦЯЛЕНЫХ ПУНКТАЎ НАРАД, СЁНЬНЯ НА ТЭХНІЧНАЙ НАРАДЗЕ Ў ДЫРЭКТАРА ДАНЫ САМЫЯ КАНЧАТКОВЫЯ ТЭРМІНЫ З ТЫМ, КАБ З 1 ЖНІЎНЯ ПАЧАЦЬ ПОЎНАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАМФІНПЛЯНУ І КАБ З 1-ГА-Ж ЖНІЎНЯ НАЧАЛЬНІКІ ЦЭХАЎ І МАЙСТРЫ ДАЛІ РАПАРТ ДЫРЭКТАРУ ПРА ГЭТЫЯ ПЕРШЫЯ ЗАВАЯВАНЬНІ ПРАМФІНПЛЯНУ.

ГАЛОЎНЫМ ТОРМАЗАМ У ГЭТАЙ ПЯЦІДНЕЎЦЫ БЫЎ КАВАЛЬСКІ ЦЭХ. ЯН ДАЎ БАЛТЫ З ПАТАЙНОЮ ГАЛОЎКАЮ ТАКОЙ ЯКАСЬЦІ, ШТО ГАЛОЎКІ ПРЫХОДЗІЛАСЯ АБТОЧВАЦЬ, АЛЕ ДА АБТОЧКІ ГЭТЫХ ГАЛОВАК НЯ МОГ БЫЦЬ ПРЫСТАСАВАНЫ НІ АДЗІН ВАРШТАТ. КУЗЬНЯ-Ж ЗАТРЫМЛІВАЛА І ІНШЫЯ МАТАР'ЯЛЫ І ДЭТАЛІ, ЯК РАСКОСЫ І ПАДКОСЫ, ЗАКЛЁПКІ І ІНШ., ШТО ВЫКЛІКАЛА ВЯЛІЗНЫЯ ПЕРАБОІ І Ў МЭХАНІЧНЫМ, І Ў ЗБОРАЧНЫМ ЦЭХАХ.

ТАРМОЗІЦЦА АДПРАЎКА МАШЫН. АДПРАЎКУ ЗАТРЫМЛІВАЮЦЬ: ДРЭВААПРАЦОЎЧЫ ЦЭХ, НЕ ПАДАЮЧЫ ТАКІХ ДРОБЯЗЯЎ, ЯК ПАДПОРКІ ДЛЯ СТАЛОЎ; КАВАЛЬСКІ ЦЭХ, ЯКІ НЕ ЎПРАЎЛЯЕЦЦА ПАДАВАЦЬ КАЛЁСЫ І ДЛЯ ЗБОРШЧЫКАЎ І ДЛЯ ЗАПАСУ НОВЫХ МАШЫН, ЯКІЯ РАНЕЙ ВЫПУСКАЛІСЯ БЕЗ КАЛЁС; НЕДАХВАТ ЧОРНАРАБОЧЫХ ДЛЯ АДПРАЎКІ. ДЛЯ ЗНІШЧЭНЬНЯ ГЭТЫХ НЕДАХОПАЎ УЖЫТЫ НЕАБХОДНЫЯ ЗАХАДЫ, І ЗРЫЎ АДПРАЎКІ МАШЫН БУДЗЕ НЕАДКЛАДНА ЛІКВІДАВАНЫ.

ВЫЯЗНАЯ ЎДАРНАЯ БРЫГАДА «ЗЬВЯЗДЫ».

Даклад выязной брыгады „Зьвязды" на бюро калектыву КП(б)Б Гомсельмашу

На бюро парткалектыву Сельмашу быў заслухан даклад выязной брыгады «Зьвязды». Бюро парткалектыву цалкам ухваліла ўсю работу брыгады «Зьвязды» і асабліва падкрэсьліла вялізарную ролю брыгады ў барацьбе з прарывам на Гомсельмашы, у барацьбе з непаладкамі і апартуністычнымі настроямі і тэорыямі некаторых сельмашаўскіх кіраўнікоў. Таксама бюро парткалектыву запрапанавала пад асабістую адказнасьць дырэктара нанава перагледзець усе матар'яльны і сыгналы «Зьвязды» з тым, каб праверыць, наколькі прапановы «Зьвязды» праведзены ў жыцьцё, і ўсе невыкананыя дагэтуль прапановы неадкладна ажыцьцявіць.

Выязная ўдарная брыгада «Зьвязды»: Арк. ЗАРУБЕЖНЫ, Дз. БОЙЧЫК, Ян. СКРЫГАН.

ПЛЕНУМ ЦКК КП(б)Б

Пасьля дакладу тав. Панюдава аб становішчы і задачах транспарту з суседкладам, выступіў нам. старшыні ЦКК КП(б)Б т. ІВАНОЎ.

Тав. ІВАНОЎ свой суседклад аб становішчы і далейшых перспэктывах разьвіцьця транспарту і аб падрыхтоўцы да асеньня-зімовых перавозак пачынае з указаньняў на вялізарны рост прамысловасьці, будаўніцтва новых фабрык і заводаў, рост сацыялістычнага сэктару сельскай гаспадаркі, што выклікае неабходнасьць бурнага разьвіцьця транспарту, як аднаго з найбольш важных вучасткаў народнай гаспадаркі.

Пасьпяховае выкананьне пяцігадовага пляну ў БССР значна павысіла грузазварот чыгуначнага транспарту. Калі ў 1929 годзе грузазварот раўняўся 8,3 млн. тон, дык у 1930 г. ён дасягнуў ужо 11,5 млн. тон, што перавышае з даваенным часам складае каля 400 проц.

І ўсё-ж, ня гледзячы на відавочныя посьпехі, якія мы маем у справе разьвіцьця чыгуначнага транспарту, цяперашняе становішча чыгунак і іх абстапляньне зьяўляецца далёка неадпавядаючы таму размаху будаўніцтва, які мы маем у БССР.

Сыстэма абязьлічнай язды на паравозах і ўкаранэньне абязьлічкі ва ўсе галіны транспартнай гаспадаркі ў канцы 1930 году і ў пачатку 1931 пагоршылі становішча паравознага парку, выклікаўшы падзеньне працоўнай дысцыпліны і зьніжэньне прадукцыйнасьці працы. На большасьці чыгуначных вузлоў ня была выконана дырэктыва партыі аб адзіначальні. Тарыфная работа прафсаюзаў заставалася адным з слабейшых вучасткоў ва ўсёй рабоце чыгуначных прафсаюзных арганізацый.

Спыняючыся на пытаньнях рэканструкцыі транспарту, тав. Іваноў заваграе ўвагу пленуму ЦКК на тым, што ПАСТАНОВА ЦК УсеКП(б) АБ РЭКАНСТРУКЦЫІ І РАЦЫЯНАЛІЗАЦЫІ ТРАНСПАРТНАЙ ГАСПАДАРКІ ДА ГЭТАГА ЧАСУ Ў НАЛЕЖНАЙ МЕРЫ НЯ ВЫКАНАНА.

Тав. Іваноў падкрэсьлівае, што пастанова ЦК УсеКП(б) аб увядзеньні спаранай язды на паравозах сустрэла супраціўленьне з боку пасобных кіраўнікоў. У той час, як шырокія масы чыгуначнікаў з вялізарным энтузіязмам падхапілі пастановы партыі і ўзяліся за іх непасрэдную рэалізацыю, адміністрацыя раёнаў і дырэкцыі чыгунак часамі ТАРМАЗІЛІ ЎВЯДЗЕНЬНЕ СПАРАНАЙ ЯЗДЫ. У чыгуначных раёны 11 чэрвеня 1931 г. быў спушчан загад дырэкцыі Заходніх чыгунак, у якім, між іншым, гаварылася:

«Абязьлічаная язда НЯ ЎСЮДЫ (!) дала чаканыя вынікі. Неабходна шляхам дакладнага абсьледваньня праверыць работу брыгад пры рознага роду сыстэмах і ўстанавіць ТУЮ З ІХ, ЯКАЯ БУДЗЕ НАЙБОЛЬШ ВЫГОДНАЯ ПА МЯСЦОВЫХ УМОВАХ...»

Гэта пасьля жорсткіх дырэктыў партыі і ЦК УсеКП(б) і пасьля загаду наркому шляхоў зносін! (ад 5 мая).

Трэба адзначыць, што Заходняя чыгунка ня выканала дырэктыў партыі і НКШЗ аб пераходзе на спараную язду. Паводле дырэктыў абязьлічка павінна была быць ліквідавана да 5-III 1931 г. Ня гледзячы на гэта, яшчэ на 14—VI існавала абязьлічка на манэўровых і некаторых пасажырскіх паравозах. Напрыклад, зрывы ПА ЖЛОБІНСКІМ раёне склададі 76 проц., а па дэпо АСІПАВІЧЫ—95 проц. За апошні час назіраюцца вялікія зрывы спаранай язды на паравозах ПА АРШАНСКІМ раёне. У сярэднім спараная язда па дэпо Ворша за тры месяцы па пасажырскіх паравозах склала 56,1 проц., а па таварных—60,82 проц. Яшчэ ёсьць рад паравозаў, дзе зусім НЕ ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЬЛІЧКА.

Тав. Іваноў падае лічбы, з якіх відаць, што за апошняе паўгодзьдзе сярэднясутачны прабег таварных паравозаў значна ўзрос, зьнізіўся процант хворых паравозаў і павялічыўся процант сьледаваньня таварных цягнікоў па расхладзе. Усё-ж спэцыяльны ездараўляючы рамонт паравозаў праводзіцца невыстарчальнымі тэмпамі: пры прамыўках ігнаруюцца тэхнічныя правілы падрыхтоўкі, прабег паміж прамыўкамі перавышае ўстаноўленую норму, што ня можа не адбіваць на паравозным парку. Ёсьць дзесяткі фактаў, калі дэпо чыгуначных раёнаў атрымліваюць з капітальнага рамонту нядобраякасныя паравозы, ЯКІЯ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ПРЫХОДЗІЦЦА НА ПАРАВОЗНЫМ ПАРКУ. ЯКІЯ ПРАЗ НЕКАЛЬКІ ДЗЁН ПРЫХОДЗІЦЦА ЗНОЎ ЗДАВАЦЬ У КАПІТАЛЬНЫ РАМОНТ.

Спыняючыся на пытаньнях заработнай платы, тав. Іваноў падае некалькі прыкладаў, якія красамоўна гавораць за тое, што прагрэсіўная зьдзельшчына ў паравозных брыгадах на Зах. чыгунцы амаль ня ўжываецца. ЗЬДЗЕЛЬНАЯ АПЛАТА ПА МЫТ ЧЫГ. ДАЛА НАДЗВЫЧАЙ ДОБРЫЯ РЭЗУЛЬТАТЫ І ЗАРАЗ УВОДЗІЦЦА Ў КАНДУКТАРСКІХ БРЫГАДАХ. Ураўніроўка значна адбіваецца на якасьці рамонту і выкананьні вымяральнікаў. На асобных чыгуначных раёнах яшчэ ёсьць такое становішча, калі чорнарабочы атрымлівае большую заработную плату, чым кваліфікаваны рабочы.

Паводле пастановы партыі і ўраду чыгункі павінны былі з 1 ліпеня перайсьці на гаспадарчы разрахунак. Ажыцьцяўленьне гэтай пастановы сустракае коснасьць і прававартуністычныя адносіны з боку пасобных кіраўнікоў работнікаў чыгункі. Начальнік Жлобінскага эксплёатацыйнага раёну піша:

«ПЕРАВОД НА ГАСПАДАРЧЫ РАЗРАХУНАК УСІХ ЗЬВЕНЬНЯЎ ТРАНСПАРТНАЙ ГАСПАДАРКІ Ў СУЧАСНЫ МОМАНТ, Г. ЗН. У СЯРЭДЗІНЕ БЮДЖЭТНАГА ГОДУ АЖЫЦЬЦЯВІЦЬ НЕМАГЧЫМА».

Тав. Іваноў падробязна спыняецца на становішчы падрыхтоўкі да асеньня-зімовых перавозак.

Падрыхтоўка да асеньня-зімовых перавозак праходзіць неадвальняюча і асабліва з боку клієнтуры транспарту: старыя склады не рэмонтуюцца і не дэзынфэктуюцца для прыёму эбожжавых грузаў, рэйкавыя і гужавыя пад'езныя шляхі знаходзяцца ў вельмі дрэнным стоновішчы. Побудова новых складаў праходзіць марудна, а месцамі яшчэ і ўсім на рэспачата.

ПЛЯНЫ АСЕНЬНЯ-ЗІМОВЫХ ПЕРАВОЗАК У БССР ЗЬЯЎЛЯЮЦЦА ЗУСІМ РЭАЛЬНЫМІ. Станцыі і вузлы па сваім разьвіцьці целкам забясьпечваюць грузапаток у разьмеры, які вызначан плянам па асеньня-зімовых перавозках. Бясспрэчна, гэтыя пляны могуць быць выкананы толькі пры балявой ударнай рабоце кожнага зьвяна транспарту. У гэтым сэнсе характэрна, што пляны асеньня-зімовых перавозак НІ НА АДНЫМ З ВУЗЛОЎ НЕ ДАВЕДЗЕНЫ ДА РАБОЧАГА.

У заключэньні тав. Іваноў гаворыць аб тым, што задачы па сацыялістычнай рэканструкцыі і рацыяналізацыі транспартнай гаспадаркі і пляны асеньня-зімовых перавозак могуць быць выкананы пры ўмове мабілізацыі чыгуначных партарганізацыяў шырокіх мас рабочых, пры ўмове перабудовы ўсёй партыйна-масавай і прафсаюзнай работы.

У дзкаднік „6 гігантаў"

уключыўся толькі Менскі чыгуначны вузел

Тэрміны пуску 518 прадпрыемстваў наблізаюцца. Ужо першыя 183 уступілі ў строй. Савецкі саюз пакрываецца густой сеткай новых заводаў і фабрык. Гэтым самым яшчэ больш узмацняюцца пазыцыі сацыялізму, забясьпечваецца хутчэйшае завяршэньне пабудовы фундаманту сацыялістычнай эканомікі, хутчэйшы ўздым матар'яльна - бытавога становішча рабочай клясы. Засталіся ўсяго месяцы да пуску такіх гігантаў індустрыі, як Магнітабуд, Кузьнецбуд, Харкаўскі трактарабуд і інш.

Для сваячасовага пуску асноўных гігантаў рашаючым зараз зьяўляецца дастаўка абсталяваньня і мантаж. Таму сваячасовае выкананьне заводамі - пастаўшчыкамі заказаў на абсталяваньне —важнейшая задача.

Абвешчаны з 25 ліпеня па ініцыятыве газэты «За індустрыялізацыю» усесаюзны дакадник 6 гігантаў (Магнітабуд, Кузьнецбуд, Аўтабуд., Бярэзьнікаўскі камбінат, Харкаўскі трактарабуд, Уральскі машынбуд) мае на ўвазе праверку сваячасовага выкананьня заказаў на іх абсталяваньне.

Белмэталяб'яднаньне ў сувязі з дакадникам дала распараджэньні па ўсіх мэталязаводах БССР аб выкананьні заказаў для памянёных 6 гігантаў без чаргі. Аднак, Белмэталяб'яднаньне не накладапілася нават высьвятліць, на якіх заводах, якія заказы выконваюцца для гэтых пабудоў і не забясьпечыла праверку іх выкананьня. Калі мы звярнуліся з запытаньнем аб гэтым у Белмэталяб'яднаньне нам кіраўнікі не маглі на гэта адказаць.

Трэба адзначыць, што толькі адзін Менскі чыгуначны вузел па-сапраўднаму ўключыўся ў дакадник, па-бальшавіцку адказаўшы на адозву рабочых Магнітбуду, узяўшы на сябе рад канкрэтных самазабавязацельстваў па сваячасовым прасоўваньні імпартнага абсталяваньня для Магнітабуду і адразу прыступіўшы да рэалізацыі гэтых самаабавязацельстваў.

Мы прымушаны канстатаваць, што на заводзе імя Варашылава, які паказаў бальшавіцкія тэмпы забясьпячэньня Шарыкападшыпнікбуду, выкананьне ўмоў дакадника і заданьняў пастаўшчыкам Магнітабуду і Кузьнецбуду, але на жаль ён ня мог нам адказаць, як гэтыя заказы выконваюцца і наогул, як мяркуюць адзначыць варашылаўцы дакадник 6 гігантаў.

На працягу дакадніка трэба дабіцца поўнага выкананьня заказаў 6 гігантаў індустрыі і бесьперабойнага прасоўваньня грузаў для гэтых пабудоў. Гіганты індустрыі павінны быць сваячасова пушчаны ў ход.

Заводаскія і транспартныя насьценгазэты павінны ў гэтай справе адыграць значную ролю. Трэба ўзьняць шырокую кампанію за выкананьне заказаў у тэрмін, за сваячасовую адпраўку і прасоўваньне грузаў для памянёных пабудоў.

Культпроп ЦК КП(б)Б 31-га ліпеня г. г.

СКЛІКАЕ

ЎСЕБЕЛАРУСКУЮ НАРАДУ

рэдактароў раённых газэт (ільнакапняводчых раёнаў з удзелам прадстаўнікоў цэнтральных установаў (Калгасцэнтру, Наркамзему, Ільнатрэсту і г. д.). Нарада адбудзецца ў 4 гадз. дня ў памяшканьні малой залі ЦК КП(б)Б.

ПАРАДАК ДНЯ:

1) Пытаньні ўборкі і першапачатковай апрацоўкі ільну і канапель і задачы цэнтральнага і раённага друку (дакладчыкі: НКЗ, Калгасцэнтр).

2. Даклады газэт: цэнтральных—«Калгаснік Беларусі», «Чырвоная Зьмена»; раённых: горацкай і лепельскай.

На нараду абавязковая яўка рэдактароў раённых газэт (ільнакапняводчых раёнаў) і камуністаў-работнікаў усіх цэнтральных газэт.

КУЛЬТПРОП ЦК КП(б)Б.

Ганебны баланс

Торфазавод „Чырвоная Беларусь" выканаў сэзоннае заданьне на 2,1%

БЫХАЎСКІ РАЙКАЛГАСАЮЗ ВЫСТУПАЕ СУПРОЦЬ ПАСЫЛКІ КАЛГАСЬНІКАЎ НА ТОРФАРАСПРАЦОЎКІ

Гадавы плян здабычы торфу на торфазаводзе «Чырвоная Беларусь»—пад пагрозай зрыву.

НА 20-ГА ЛІПЕНЯ ЗДАБЫТА 941,6 ТОН, ШТО СКЛАДАЕ 2,1 ПРОЦ. СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ.

Выключна па віне адміністрацыі заводу спынілася здабыча фрэзэрнага торфу. Машыны гаручымі матар'ялямі не забясьпечаны і стаяць цэлымі днямі без работы.

Кіраўніцтва заводу і іншыя заводскія арганізацыі зусім не клапоцяцца, каб наладзіць харчаваньне рабочых, забясьпечыць іх дэфіцытнымі таварамі.

БЫХАЎСКІ РАЙКАЛГАСАЮЗ ЗАМЕСТ ТАГО, КАБ ЗАБЯСЬПЕЧЫЦЬ ТОРФАЗАВОД ПОЎНАЙ КОЛЬКАСЬЦЮ РАБОЧЫХ РУК З КАЛГАСАЎ, ДАЕ ГАЛАВАЦЯПСКІЯ ЗАГАДЫ КАЛГАСАМ ВЯРНУЦЬ УСІХ КАЛГАСЬНІКАЎ-АДЫХОДНІКАЎ, ЯКІЯ ПРАЦУЮЦЬ ЗАРАЗ НА ТОРФАРАСПРАЦОЎКАХ.

Райком КП(б)Б, які даў цьвёрдую воду рабсілаў у асноўным з калгасаў, і ПА СЁНЕШНІ ДЗЕНЬ НЕСК АСАВАЎ ГАЛАВАЦЯПСКАЯ ДЫРЭКТЫВЫ РАЙКАЛГАССАЮЗУ.

На торфараспрацоўчых вучастках не ладзяцца ніякай культурна-асьветнай работы, у выніку гэтага пашырэнне ўсялякай блатнушчыны аб тым, што «ня варта працаваць на торфараспрацоўках, бо заробленыя грошы ўсё роўна забяры калгас».

Гэтай кулацкай агітацыі ніякага адпору не даюць.

Аб прамове тав. СТАЛІНА і пастанове ЦК і СНК БССР па пытаньні торфараспрацовак рабочыя торфазаводу нічога ня ведаюць. Сацыялістычнае спаборніцтва і ўдарніцтва не выкарыстоўваюцца, як адзін з асноўных метадаў сацыялістычных форм работы.

НА ЗАВОДЗЕ НЕ ЛІКВІДАВАНА АБЯЗЬЛІЧКА, У СЫСТЭМЕ АПЛАТЫ РАБОЧЫХ НЯ ЗЖЫТА ЎРАЎНІЛАЎКА.

ПАРТЫЙНАЯ АРГАНІЗАЦЫЯ ЗАВОДУ ПАВІННА ЛІКВІДАВАЦЬ ГЭТЫЯ СУР'ЁЗНЫЯ ПРАРЫВЫ І ПА-БАЛЬШАВІЦКУ МАБІЛІЗАВАЦЬ МАСЫ РАБОЧЫХ, КАЛГАСЬНІКАЎ І БЯДНЯЦКА-СЕРАДНЯЦКАЯ ЧАСТКІ ВЁСКІ НА БАЛЯВОЕ ВЫКАНАНЬНЕ СЭЗОННАГА ЗАДАНЬНЯ ТОРФАЗДАБЫЧЫ.

ТАРФЛІНІК.

Выкананьне сэзоннага заданьня торфаздабычы па БССР

З 19-га па 24 ЛІПЕНЯ



КУЧКА-ЗЬБІРАЛЬНІК НА РАБОЦЕ ПА ЗБОРЫ ФРЭЗЭРНАГА ТОРФУ (ТОРФАЗАВОД «ШЛЯХ САЦЫЯЛІЗМУ)

ЗДАБЫЧА ТОРФУ

За 23 ліпеня

ІДУЦЬ НАПЕРАДЗЕ:		
«Ленінскі шлях»	—	105,9 проц.
«1 мая»	—	92,0 „
«Чырвоны тарфянік»	—	76,8 „
«Міханавічы»	—	74,2 „
«Новая Беларусь»	—	70,1 „
«Закрашынскі мох»	—	67,9 „
«Зьвязда»	—	63,7 „
«Бальшавік»	—	60,0 „
АДСТАЮЦЬ:		
«Смалявічы»	—	7,5 проц.
«Рэмізава»	—	12,9 „
«Чырвоная Беларусь»	—	14,8 „
«Свабода»	—	15,2 „
«Калектыўная праца»	—	16,9 „
«Вялікі мох»	—	19,3 „
«Чырвоны сьцяг»	—	14,8 „

Сэзоннае заданьне		
ІДУЦЬ НАПЕРАДЗЕ:		
«Ленінскі шлях»	—	68,2 проц.
«Чырвоны тарфянік»	—	64,4 „
«Закрашынскі мох»	—	54,0 „
«Новая Беларусь»	—	52,1 „
«Бальшавік»	—	46,2 „
АДСТАЮЦЬ:		
«Вольніца»	—	0,7 „
«Рэмізава»	—	1,3 „
«Смалявічы»	—	1,7 „
«Вялікі мох»	—	2,7 „
«Чырвоная Беларусь»	—	2,8 „
«Калектыўная праца»	—	9,9 „
«Чырвоны сьцяг»	—	15,0 „
«Свабода»	—	23,7 „

Ход сплаву па БССР

Да 20-га ліпеня па БССР падвезена да сплаўных прыстаняў 2.134 тыс. кбм. будаўнічых матар'ялаў і 375.000 кбм. дроў — разам 2.509 тыс. кбм., або 58,6 проц. пляну.

Пушчана ў сплаў 2.201 тыс. кбм., 51,4 проц. плянавага заданьня і 87,7 проц. падвезенай колькасьці лесматар'ялаў.

Да канчатковых пунктаў прыбыла 1.510 тыс. кбм. лесматар'ялаў, або 35,2 проц. пляну, ці 68,6 проц. колькасьці пушчанага лесу.

З прыбыўшай драўніны выгружана 338.635 кбм. — 7,9 проц. пляну.

Знаходзіцца ў сплаве 692.000 кбм., або 31,4 проц. пушчанага лесу.

На першым месцы па сплаве драўніны ідзе ЗА'ОДНЯ - ДЗЬВІНСКАЯ СПЛАЎНАЯ КАНТОРА, якая пусьціла ў сплаў 55,9 проц. пляну, ці 94,4 проц. падвезенага да прыстаняў лесу.

А. СТАЛЕВІЧ

НАПЯРЭДАДНІ БАЁЎ ЗА ЎЛАДУ

Да вынікаў V пленуму ЦК КПЗБ)*

V пленум ЦК КПЗБ, які адбыўся ў верасьні месяцы, адзначыў, што ў краіне і надалей паглыбленьне гаспадарчага крызісу будзе бараўніць грунт рэвалюцыі і гэтым садзейнічаць шпаркаму нарастанню рэвалюцыйнай сітуацыі, што ўжо выяўляецца ў форме больш масавых заваграных баёў, стыхійных выбухаў уключна да партызанскіх выступленьняў.

Апошнія падзеі ў Польшчы і Заходняй Беларусі са ўсёй відавочнасьцю пацьвердзілі правільнасьць ацэнкі сітуацыі, зробленай V пленумам. Бурная забастоўка трамвайшчыкаў у Варшаве Катовіцах, барыкадныя баі беспрацоўных у Жарардаве, Плоцку, Велюне, масавы адпор сілам супроць спагнаньня падатку—вось рэвалюцыйная хроніка апошніх некалькіх тыдняў у каронным Польшчы.

На Заходняй Беларусі, дзе, як адзначаў V пленум, натыкаецца некаторае адставаньне ад рэвалюцыйнага руху сёй Польшчы, цяпер маем выраўненьне рэвалюцыйнага фронту на лініі рабочага і сялянскага руху.

Апошнія рэвалюцыйныя праявы ў рабочым руху на ЗБ вельмі паказальныя для ацэнкі агульна-польскага рэвалюцыйнага руху. Трэба прыняць пад увагу, што на Заходняй Беларусі аб'ектыўныя ўмовы менш спрыяючыя для разгортваньня барацьбы пралетарыяту, чым у каронным Польшчы. Тут ёсьць значная лічбовая слабасьць пралетарыяту, яго нацыянальная стракатасьць, што выкарыстоўваюць для свайй разбуральчай работы сацыял-фашысты, больш-ж дакладнасьцей, бо пралетарыят ясьней зьвязаны з вёскай і з гарадской дробнай буржуазіяй, тут нарэшце, імпэріяльная палітыка фашысцкага Гураду выкідае на брук больш як беспрацоўных, што сьведчыць аб тым, што рад цалою грабежніцкай палітыкі на прыгнобленых беларускіх і украінскіх землях хоча зьмягчыць крызіс у цэнтральнай Польшчы.

Таксама трэба адзначыць слабейшы арганізацыйны ахоп рабочае клясы рэвалюцыйным анты-фашысцкім прафрухам. Ня гледзячы на гэтыя аб'ектыўныя абставіны, рэбочы рух на Зах. Бел., асабліва ў апошнія часы, дасягнуў узроўню агульна-польскага.

Значна ажывіліся і прынялі больш масавы характар выступленьні сялян супроць падаткаў, шарваркаў, хамасацыі, ліхварства і розных кабалы. Асабліва бурна ўздымаецца хваля стыхійнага абурэньня працоўных мас вёскі супроць акупацкай улады, супроць абшарніцка-кулацкай прыгонтай эксплёатацыі. Цяпер на Зах. Бел. сталае зьявішча: падпалы панскіх двароў, кулацкіх і асадніцкіх сяляб, урадавых установаў, пасёлгэтарскіх школ, замахі на чыгункі і інш. Як паведамляе «Жыцьцё Навагрудзкае», у Баранавіцкім павеце зьявіўся партызанскі ўзброены атрад, які ў сутыцьці з карнай экспедыцыяй забіў паліцэйскага афіцэра і некалькі паліцыянтаў параніў. Выразнае выяўленьне партызанскай барацьбы мае нядаўні факт бомбавага замаху на цягнік пад ст. Яшуны.

Грунт пад нагамі акупантаў гарыць. Пралетарыят Варшавы, Дамбравы Сілезіі што-раз мацней ударае на ўстоях капіталізму ў Польшчы. Неспакойна і ў арміі. Фашысцкія ўлады ў душэльні рэвалюцыйнага руху абыходзяцца пакуль сіламі паліцыі і фашысцкіх банд. Фашызм ня хоча стыкаць армію з рэвалюцыйнымі радамі рабочых і сялян, баіцца, каб тыя-ж рабочыя і сяляне, апранутыя ў вайсковыя мундзіры, акупуючыся ў полыма рэвалюцыйных баёў, не пазвярнулі штыкоў супроць капіталістаў і памешчыкаў. Фашысцкі ўрад у каронных экспедыцыях на Зах. Украіне і Зах. Беларусі ўжывае адборныя кулацкія часткі войска. Былі выпадкі (Гроева), калі афіцэры адмаўлялі цывільным уладам у ваеннай дапамозе пры разгроме рэвалюцыйных выступленьняў рабочых, бачачыся, што войска пройдзе на бок мас, якія змагаюцца. Аднак, карныя экспедыцыі ўсё больш разрастаюцца ў грамадзянскую вайну, зрыўся ня можа доўга застацца ў баку рэвалюцыйных падзей, якія разгортваюцца. І вось гэты стык армії з масамі можа быць пагібельным для фашысцкай дыктатуры.

Вельмі характэрным для апошніх рэвалюцыйных падзей зьяўляецца тое, што найменшы канфлікт паміж працай і капіталам выклікае магутныя салідарныя выступленьні аж да агульнай забастоўкі, выступленьні, якія часта-густа адбываюцца пад знакам палітычнай барацьбы і контрнаступленьня. Прыбываюць новыя рэвалюцыйныя атрады і саюзьнікі пралетарыяту. Маса цягнецца да адкрытых рэвалюцыйных выступленьняў, да адзіньня ў баёх на вуліцы з усімі атрадамі арміі працы, маса хоча барацьбы за гэтую вуліцу. Нянавісьць і рэвалюцыйнае натрамаджэньне шукае выхаду ў зацятых сутычках з паліцыяй—усё часьцей падаюць газэты весткі аб усё большым ліку барыкадных баёў, аб забітых і параненых паліцэйскіх, аб разгромах магістратаў. Маса вучыцца біць клясавага ворага, і ня раз ужо ў крывавых сутычках перамагала яго на некаторы час.

Капіталістычная гаспадарка Польшчы выяўляе ўсё больш шырокія шчыліны, якія сьведчаць аб надыходзячым пе разьвале. Да прамысловага і аграрнага крызісу далучаецца і фінансавы.

На «вярхох» выразна назіраецца нарастальне дэзарыентацыі. Побач з тэрарам, які мае формы грамадзянскай вайны, фабрыканты нарэдка трусьліва ідуць на ўступкі бастуючым рабочым, каб не дапусьціць пашырэньня забастовачнай хвалі, да аб'яднаньня і ўзмацненьня рэвалюцыйных выступленьняў. Урад зьнізкае зарплату служачым, а пасьля абурэньня і пагрозы забастоўкай з боку служачых, ідзе на некаторыя ўступкі. Побач з манэўрамі тут ёсьць і моманты дэзарыентацыі, элементы таго, што вярхі ўж не так шумна-вашчальна і ўпэўнена кіруюць, як гэта яны рабілі ў часы так званай стабілізацыі. Асабліва гэта яскрава выявілася ў бюджэтнай палітыцы фашысцкага ўраду.

Паглыбленьне гаспадарчага крызісу, нарастаньне фінансавага крызісу пры ўздыме рэвалюцыйнага руху і посьпехах рэалізацыі пацігодкі ў СССР—усё гэта зьяўляецца выпікані, якія паспараюць падрыхтоўцы вайны супроць СССР з боку польскага і міжнароднага імпэрыялізму. Факты апошніх палітычных падзей у Эўропе асабліва ў сувязі з праектамі Гувэра, паказваюць, што антысавецкі блёк усё больш кансалідуецца і актывізуецца, што пагроза інтэрвэнцыі і надалей застаецца вельмі актуальнай.

Бязумоўна, што важнейшае значэньне ў справе разгортваньня рэвалюцыйнага руху, у справе пакрываньня імпэрыялістычных, антысавецкіх плянаў Польшчы, зьяўляецца суб'ектыўны чынньнік—кампартыя. Пленум адзначыў, што «партыя павінна максымальна ўзмацніць сваю актыўнасьць па заваяваньні рашаючай большасьці рабочай клясы і ўзьняцьці ае баявой актыўнасьці, як перадавой рэвалюцыйнай клясы на ўзмацненьні барацьбы за саюзьнікаў пралетарскай рэвалюцыі, канцэнтрацыі ўсіх сіл на адпор фашысцкаму т

Праверым гатоўнасьць збожжазагатоўчых арганізацый

30 ЛІПЕНЯ УСЕСАЮЗНАЯ ПРАВЕРКА ПАДРЫХТОЎКІ ДА ЗБОЖЖАЗАГАТОВАК

РАЁНЫ БССР, УКЛЮЧАЮЦЦЯ Ў 15-ДЗЕНЬНІК АГЛЯДУ!

„Усе партарганізацыі і ў асаблівасьці збожжазагатоўчыя органы павінны цьвёрда асвоіць, што толькі тое збожжа можа лічыцца загатоўленым, якое не загрузла ў так званых глыбінных пунктах, які падвезен да прыстанцыйных пунктаў, элеватараў і млыноў" (з пастановы ЦК УсеКП(б) аб збожжазагатоўках)

НАРКАМСНАБ СССР, ПРАЎЛЕНЬНІ ХЛЕБЖЫВЁЛАЦЭНТРУ, КАЛГАСЦЭНТРУ сумесна з рэдакцыямі цэнтральных газэт: «ПРАВДА», «КОМСОМОЛЬСКАЯ ПРАВДА», «ИЗВЕСТИЯ ЦИК», «КООПЕРАЦИЯ, СНАБЖЕНИЕ И ТОРГОВЛЯ», «СОЦЗЕМЛЕДЕЛИЕ» і «За хлеб» арганізуюць з 30 ЛІПЕНЯ ПА 15 ЖНІЎНЯ 15-ДЗЕНЬНІК ПРАВЕРКІ ПАДРЫХТАВАНАСЬЦІ ЗАГАТОЎЧЫХ ОРГАНАЎ, МТС І КАЛГАСАЎ ДА ЗАГАТОВАК ЗБОЖЖА І ВЫВАЗУ ЯГО НА ПРЫСТАНЦЫЙНЫЯ І ПРЫСТАНЬСКІЯ ПУНКТЫ.

Цэнтральнай задачай агляду зьяўляецца праверка выкананьня ЗАГАТОЎЧЫМІ ОРГАНАМІ пастановы ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня 1931 г. аб арганізацыі збожжазагатовак у кампаніі 1931-32 г. Практычна праграма агляду складаецца з наступных пытаньняў:

I. Праверка гатоўнасьці загатоўчых органаў у адносінах тэхнічнай базы збожжазагатовак

1. Выкананьне пляну новага прыстанцыйнага элеватарна-складскога буданіцтва.

2. Рамонт існуючай і мабілізацыя новай складской плошчы і тэхнічнае абсталяваньне сеткі прыёмных збожжавых пунктаў.

3. Выкананьне дырэктыў ЦК загатоўчымі органамі аб складской сетцы так званых глыбінных пунктаў.

4. Мабілізацыя складу для прыёмкі збожжа на прыстанцыйных, прыстаньскіх пунктах.

5. Арганізацыя грамадзкага кантролю на прыёмных пунктах Саюзхлеба.

6. Арганізацыя Дзаржбанкам у прыстанцыйных пунктах прыпісных кас з агульнай колькасьцю да 1.500.

7. Забясьпечанасьць збожжазвароту тарай, мабілізацыя тары за лік унутраных рэсурсаў і да рамонт.

8. Арганізацыя бясстарнай перавозкі збожжа.

9. Падрыхтаванасьць загатоўчых органаў да поўнага выкарыстаньня гужавога транспарту свайго раёну і аўтатранспарту.

10. Выкананьне органамі НКПС дырэктыў ЦК: «Забясьпечыць неабходную колькасьць вагонаў для пагрузкі збожжа. Забясьпечыць пункты пагрузкі рабочай сілай і ўсімі неабходнымі для пагрузкі збожжа матар'яламі, шчытамі і г. д.».

II. Праверка падрыхтаванасьці кадраў загатоўчых органаў да збожжазагатовак

1. Выкананьне дырэктывы ЦК УсеКП(б); «Наркамснабу сумесна з абласнымі, краявымі камітэтамі і ЦК нацкампартый неадкладна правесьці і ўкамплектаваць падрыхтаванымі кадрамі збожжазагатоўчы апарат элеватара, млына, ссыпнога пункту, адабраўшы для гэтай мэты неабходную колькасьць работнікаў, якія маюць вопыт у збожжазагатовках як на пастаянную работу, так і на часовую ў дапамогу загатоўчым органам і мясцовым арганізацыям».

2. Выкананьне органамі Хлебжывёлацэнтру, Саюзхлеба, Трактарацэнтру і мясцовых камсамольскіх арганізацый пастановы ЦК УсеЛКСМ «аб мабілізацыі 50 тысяч камсамольцаў у сыстэму Хлебжывёлацэнтру, Саюзхлеба і Трактарацэнтру на пасталянную і часовую работы».

3. Выкананьне Хлебацэнтрам і Саюзхлебам курсавых мерапрыемстваў па падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы збожжазагатоўчых кадраў.

4. Выкананьне органамі Хлебажывёлацэнтру дырэктывы ЦК: «Для пасьпяховага выкананьня збожжазагатовак, а значыць і вывазу збожжа ў кожным сельсавеце збожжавых раёнаў павінны быць вылучаны ўпаўнаважаныя Хлебажывёлацэнтру па загатоўках».

5. Выкананьне дырэктывы ЦК: «Устанавіць зарплату работнікам загатоўчага апарату ў простай сувязі з выкананьнем мільканных і якасных паказальнікаў іх работы».

III. Плянаваньне збожжазагатовак

1. Устанаўленьне і дача плянаў адміністрацыйным раёнам.

2. Дазядзеньне пляну да сяла.

3. Вызначэньне збожжавых плянаў па калгасах і МТС.

4. Вызначэньне збожжавых плянаў па аднаасобным сэктары.

IV. Праверка сумесна з „Зернотрестом" і інш. саўгасаб'яднаньнямі падрыхтаванасьці саўгасаў да здачы збожжа

1. Устанаўленьне збожжафуражных балянсаў і плянаў здачы збожжа па асобных саўгасах.

2. Падрыхтаванасьць саўгасаў і пунктаў Саюзхлеба да арганізацыі вывазу і прыёмкі саўгаснага збожжа.

V. Праверка падрыхтаванасьці калгасаў і МТС

1. Выкананьне дырэктывы ЦК: «У калгасах, а таксама ў раёнах МТС павінен быць вылучан спэцыяльны член праўленьня ці здэні з намесьнікаў дырэктара МТС, ведучы свае практычную работу па здачы збожжа, забясьпечаньні хутчэйшай яго перавозкі, зборы тары, уліку абмалочанага і зданага збожжа і г. д.».

2. Забясьпячэньне кіраўніцтва з боку МТС абслугоўваных імі калгасаў у здачы збожжа, «як непасрэдной вытворчай задачы МТС» (з пастановы чэрвеньскага пленуму ЦК УсеКП(б)).

3. Праверка выкананьня пастановы ЦК аб арганізацыі камісіі садзейнасьці пры сельсаветах і калгасах.

VI. Падрыхтаванасьць аднаасобнага сэктару

1. Раздача кантрактацыйных кніжак з удакладненьнем абавязацельстваў кожнага кантрактанта па продажы збожжа дзяржаве.

2. Складаньне сьпісу запазычанасьці па кантрактацыі.

3. Устанаўленьне цьвёрдых заданьняў кулацка-заможным гаспадаркам (па раёнах, якія ўступаюць у збожжазагатоўкі).

VII. Правядзеньне арганізацыйна-масавай работы

1. Выкананьне дырэктыў ЦК аб правядзеньні шырокай масавай работы сярод калгасьнікаў і бядняцка-серадняцкіх мас: «Разгарнуць масавую работу па мабілізацыі калгасьнікаў і дабіцца таго, каб усімі працоўнымі сяўлянамі ў галіне збожжазагатовак быў усвоен і ажыцьцёўлен лёзунг «НІ АДНАГО ЦЭНТНЭРА ЗБОЖЖА ПРЫВАТНІКУ».

2. Удзел усіх прафсаюзных і грамадзкіх арганізацый у падрыхтоўцы да збожжазагатоўчай кампаніі.

3. Арганізацыя культурна-бытавога абслугоўваньня здатчыкаў збожжа.

Практычная работа па правядзеньні агляду ўскладзецца на штаб сацспаборніцтва і ўдарніцтва пры Хлебжывёлацэнтры. Для правядзеньня работы па аглядзе ў асноўныя збожжавыя раёны высылаюцца спэцыяльныя брыгады па аглядзе ў складзе прадстаўнікоў ад цэнтральных газэт і ўсіх вышэйпералічаных арганізацый.

У рэспубліках, краёх і абласьцях агляд праводзіцца паказанымі брыгадамі сумесна з мясцовымі органамі друку, Наркамснабу, загатоўчымі, калгаснымі і камсамольскімі арганізацыямі і ўпаўнаважанымі Трактарацэнтру.

ЦЭНТРАЛЬНЫ ШТАБ ВЫЛУЧАЕ СА СВАІХ ФОНДАЎ 20.000 РУБ. ДЛЯ ПРЭМІЯВАНЬНЯ РАЁНАЎ, КАЛГАСАЎ І АСОБНЫХ РАБОТНІКАЎ, ЯКІЯ ДОБРА ПАДРЫХТАВАЛІСЯ ДА ЗБОЖЖАЗАГАТОЎЧАЙ КАМПАНІІ.

„Зьвязда" уключаецца ў 15-цідзеньнік

Посьпех збожжазагатовак у вялікай ступені залежыць ад своячасовай баявой ПАДРЫХТОЎКІ загатоўчых арганізацый да правядзеньня кампаніі, ад разгортваньня масава-растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў — беднякоў і сярэднякоў, ад мабілізацыі шырокіх мас працоўных вакол збожжазагатоўчай кампаніі.

У сьвятле гэтага, набывае выключна важнае значэньне абвешчаны Наркамснабам СССР, Хлебжывёлацэнтрам, Калгасцэнтрам, Саюзхлебам, Трактарацэнтрам і рэдакцыямі маскоўскіх газэт 15-ДЗЕНЬНІК ПРАВЕРКІ падрыхтаванасьці загатоўчых органаў, МТС і калгасаў да загатовак збожжа, вывазу яго на прыстанцыйныя і прыстаньскія пункты. Праверка павінна выявіць, як выканана і выконваецца загатоўчымі арганізацыямі пастанова ЦК УсеКП(б) ад 15 ліпеня аб арганізацыі збожжазагатовак.

На працягу 15-дзеньніка (з 30 ліпеня да 15 жніўня) трэба выявіць як выконваюцца дырэктывы аб забясьпячэньні тэхнічнай базы збожжазагатовак (элеватарна-складское буданіцтва, забясьпячэньне загатовак тарою, гужавым і аўтатранспартам і г. д.), аб падрыхтоўцы кадраў загатоўчых органаў, аб плянаваньні загатовак, аб правядзеньні арганізацыйна-масавай работы і г. д.

Агляд будзе праводзіцца спэцыяльна вылучанымі праверачнымі брыгадамі ў складзе прадстаўнікоў цэнтральнага і раённага друку і загатоўчых арганізацый. Зусім зразумела, што праверачныя брыгады не павінны і на будуць абмяжоўвацца толькі выпуленьнем недахопаў, механічнай рэгістрацыяй іх. Брыгады павінны і будуць актыўна дапамагаць загатоўчым арганізацыям у ліквідацыі прарываў у падрыхтоўцы да збожжазагатовак.

«ЗЬВЯЗДА» ЎКЛЮЧАЕЦЦА Ў ПРАВЯДЗЕНЬНЕ 15-ДЗЕНЬНІКА і заклікае ўсіх рабселькораў прыняць актыўны ўдзел у правядзеньні праверкі, арганізаваць праз друк усебаковае разгортваньне падрыхтоўчых работ, узяць пад пільны кантроль падрыхтоўку арганізацый да правядзеньня збожжазагатовак і дасылаць рэгулярна ў рэдакцыю матар'ялы.

Непасрэднымі арганізатарамі і кіраўнікамі 15-дзеньніка праверкі на мясцох павінны зьявіцца мясцовыя партыйныя арганізацыі разам з рэдакцыямі раённых газэт і шматтыражак, пры актыўным удзеле савецкіх органаў і прафсаюзаў.

УДАРНАЯ ДЭКАДА РЭАЛІЗАЦЫІ ПАЗЫКІ НА ВЁСЦЫ

Раўняцца па калгасах Вушаччыны

Яны паказваюць сапраўды ўдарныя тэмпы

35 ПРОЦ. РАБОЧЫХ І СЛУЖАЧЫХ НЕ АХОПЛЕНЫ ПАДПІСКАЙ

ДУБРОЎНА, 27. (БЕЛТА.

Ня гледзячы на тое, што плян рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы» сярод рабочых і служачых выканан па 115 проц., колькасны ахоп падпіскай гэтай катэгорыі зусім нездавальняючы. Каля 35 проц. рабочых і служачых яшчэ не ахоплены падпіскай.

На фабрыцы «Дняпроўская мануфактура» пазыкай не ахоплена яшчэ 200 чалавек. Не правялася падпіска ў Сваташыцкім і Шчарбінскім вучлесгасах. У саўгасе Халоўе падпіска дагэтуль не афармлена.

Камісіі садзейнасьці, асабліва вясковыя зусім бязьдзейнічаюць. Вестак аб ходзе падпіскі сярод калгасьнікаў няма.

За бязьдзейнасьць распушчана камісія садзейнасьці пры Дубровенскім гарсавеце, якая не разгарнула шкідкай работы сярод насельніцтва.

Гарсавет і сельсаветы зусім ня кіруюць работай камісій садзейнасьці, не аддаюць увагі рэалізацыі пазыкі. Райкалгассаюз стаіць у баку ад кампаніі, не вядзе растлумачальнай работы сярод калгасьнікаў.

Калгасы Вушаччыны — наперадзе

ВУШАЧЫ. (БЕЛТА). ПА КАЛГАСАХ ШЫРОКА РАЗГАРНУЛАСЯ ПАДПІСКА НА ПАЗЫКУ. КАЛГАСЫ «ЧЫРВОНАЯ ПОЛАЧЧЫНА» І «БЯЗВОЖНІК» ПЕРАВЫКАНАЛІ ТРОХТЫДНЁВЫЯ ФОНДЫ ДАХОДУ. ЧЛЕНЫ КАЛГАСАЎ «ПАГРАНІЧНІК», «ПЕРАМОЖЦА» І «ЧЫРВОНЫ МАЯК» ПАДПІСАЛІСЯ НА МЕСЯЧНЫ ДАХОД. ДЛЯ РАЗГОРТВАНЬНЯ ПАДПІСКІ СЯРОД АДНААСОБНАГА СЭКТАРУ МАБІЛІЗОВАН ПРАФАКТЫЎ РАЁНУ. ДА КОЖНАГА РАЙМЯСНІКОМУ ПРЫМАЦАВАНЫ ПА ДВА СЕЛЬСАВЕТЫ, ДЗЕ ПРАВОДЗІЦЦА МАСАВА-РАСТЛУМАЧАЛЬНАЯ РАБОТА.



За «518» і «1040»

На рэйках самацёку

КАПЫЛЬ

На Капыльскім раёне рэалізацыя пазыкі ідзе нездавальняюча. Заданьне па рэалізацыі сярод рабочых і служачых выканана на 20 ліпеня толькі на 86 процантаў (замест 83.000 рэалізавана на 73.000 руб.).

Сярод калгасьнікаў і аднаасобнікаў павінна быць рэалізавана на 198.000 руб., аднак, да гэтага часу няма ніякіх вестак аб ходзе рэалізацыі пазыкі ў вёсцы. Уся работа ідзе самацёкам. Масава - растлумачальнай работы сярод працоўных не вядзецца. Камісіі садзейнасьці літаральна бязьдзейнічаюць. Партыйныя і камсамольскія ячэйкі і савецкія арганізацыі да гэтага часу не разгарнулі належнай работы.

Трэба дабіцца карэннага зруху ў ходзе кампаніі. Да 1-га жніўня кантрольная лічба павінна быць поўнасьцю выканана.

Валё-прабег фізкультурнікаў Барысава

Райпрафсавет і міжсаюзнае бюро фізкультуры арганізавалі з 15 да 17 ліпеня валё-прабег фізкультурнікаў па маршруце Барысаў—Зембін для дапамогі сельсаветам у рэалізацыі пазыкі «Трэці рашаючы». Фізкультурнікі правялі вялікую работу па дорозе. На Зембінскім сельсавеце брыгадай валё-прабегу зроблен падворны абход гаспадарак вёскі Кімін. На працягу 2-х гадзін было рэалізавана пазыкі на 165 руб. Валё-брыгада выпусьціла 4 нумары лётучай газэты, у, якіх крытыкавала бязьдзейнасьць сельсавету, партыйных і грамадзкіх арганізацый.

У саўгасе Васілаўка брыгада правяла агульны сход рабочых па выкананьні рэалізацыі пазыкі. На сходзе падпісалася 14 чалавек на суму каля 1.000 руб.

Падпіска працягваецца.

Калі-ж Белільнаканаплябуд дасьць нарад на гонту?

ЧАШНІКІ. На будаўніцтве чашніцкага льнаазводу патрэбна гонта для пакрыцьця пажарнага хлява, а-ва чаго ваймыляюцца сталярныя работы.

У Бешанковіцкім леспрамгасе ёсьць гонта. Калі зьвярнуліся да дырэктара леспрамгасу, каб ён адпусьціў 100 кол гонты, дык ён адказаў, што, «ня маючы на гэта пераду, я гонты не адпушчу».

Белільнаканаплябуд зусім нядбайна адносіцца да гэтай справы і да гэтага часу ня выслаў нарадаў на гонту, і па яго віне затрымліваецца пакрыцьцё гонтай хлява.

Брыгада «Зьвязды»: ДАРАШКЕВІЧ І САНЦЭВІЧ.

РЭАЛІЗУЕМ ЗАДАЧЫ,

паказаныя ў прамове тав. СТАЛІНА

Менгарком КП(б)Б мабілізуе 75 адказных работнікаў для практычнай дапамогі нізавым вытворчым ячэйкам

ПАСТАНОВА САКРАТАРЫЯТУ МЕНСКАГА ГАРАДЗКОГА КАМІТЭТУ КП(б)Б ПА ПЫТАНЬНІ АБ ХОДЗЕ ПРАПРАЦОЎКІ ПРАМОВЫ тав. СТАЛІНА НА НАРАДЗЕ ГАСПАДАРНІКАЎ І РЭАЛІЗАЦЫІ ВЫЗНАЧАЮЧЫХ З ЯЕ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ

Сакратарыят гаркому адзначае, што гістарычная прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў знайшла глыбокі водгук у рабочых масах гораду Менску, выклікала яновую хвалю працоўнага энтузіязму, новы ўздым сацспаборніцтва і ўдарніцтва, шырокі паток рабочых прапаноў.

Партарганізацыі прадпрыемстваў у большасьці сваёй своячасова мабілізавалі ўвагу рабочых мас вакол пытаньняў, закранутых у прамове тав. Сталіна, і значная частка прадпрыемстваў прыступіла да практычнага вырашэньня ва ўмовах кожнага з іх праблем, высунутых прамовай тав. Сталіна (гаспадарчы разрахунак, ліквідацыя «абязьлічкі», ураўнілаўкі і інш.).

Але побач з гэтым ёсьць рад прадпрыемстваў, якія абмежаваліся толькі прапрацоўкай прамовы, не ператварыўшы высунутых у прамове задач у практычную справу, не мабілізаваўшы ўвагу і творчую ініцыятыву рабочых мас вакол канкрэтных прапаноў па-бальшавіцкай рэалізацыі задач, высунутых прамовай правадыра партыі.

Назіраюць некаторыя прадпрыемствы (завод «Пралетары»), якія нават не прыступілі да прапрацоўкі прамовы тав. Сталіна, сьведчыць аб апартуністычнай недаацэнцы гэтага важнейшага гістарычнага дакумэнту. Без выкананьня высунутых у ім задач немагчыма далейшае прасоўваньне наперад на шляху рацыяналістычнага будаўніцтва.

Выходзячы з гэтага, сакратарыят Менгаркому КП(б)Б пастанаўляе:

У якасьці практычных мерапрыемстваў па рэалізацыі задач, высунутых прамовай тав. Сталіна, правесьці наступнае:

1. Ячэйкам КП(б)Б больш шырока разгарнуць прапрацоўку прамовы тав. Сталіна, дабіўшыся сапраўднага давядзеньня прамовы да кожнага рабочага і работніцы, скарыстаўшы прамову для яшчэ большай мабілізацыі рабочых мас вакол ліквідацыі прарываў у выкананьні прам фінпляну, для яшчэ большага ўздыму сацспаборніцтва і ўдарніцтва, зьвязаўшы прапрацоўку дырэктыў тав. Сталіна з спэцыяльным масавым зборам рабочых прапаноў па пытаньнях практычнага правядзеньня ў жыцьцё паказаньняў тав. Сталіна ва ўмовах кожнага прадпрыемства і цэху.

2. Шырока прапрацаваць прамову сярод інжынэрна - тэхнічнага персаналу і майстроў, прыцягнуўшы іх да практычнага вырашэньня пытаньняў, зьвязаных з рэалізацыяй паказаньняў тав. Сталіна.

Арганізаваць спэцыяльныя брыгады пад кіраўніцтвам інжынэрна - тэхнічных работнікаў для прапрацоўкі асобных пытаньняў, зьвязаных з гэтым (гаспадарчы разрахунак, выпуленьне ўраўнілаўкі, выпуленьне і ліквідацыю «абязьлічкі», рабсіла і інш.).

3. У галіне гаспадарчага разрахунку. Асноўную ўвагу аддаць далейшаму ўкараненьню гаспадарчага разрахунку ў цэх і брыгаду. Гэта задача павінна быць у цэнтры ўсёй работы па рэалізацыі паказаньняў тав. Сталіна.

Сакратарыят гаркому абавязвае ўсе ячэйкі праверыць выкананьне пастаноў бюро гаркому ад 12 ліпеня 1931 г. па гэтым пытаньні з тым, каб да 1-га жніўня дабіцца сапраўднага пераводу ўсіх цэхаў на гаспадарчы разрахунак.

4. У галіне ліквідацыі ўраўнілаўкі ў заработнай плаце:

а) Да 20-га жніўня правесьці масавую праверку аплаты працы па разрадах і ўнутры разрадаў і выпуленьне ўсіх выпадкаў ураўнілаўкі з тым, каб поўнасьцю зьнішчыць ураўнілаўку ў зарплаце, і тых выпадкаў, калі некваліфікаваны рабочы атрымлівае столькі-ж ці нават больш за кваліфікаванага рабочага.

б) Выявіць на кожным прадпрыемстве вядучыя прафэсіі, забясьпечыўшы паляпшэньне іх матар'яльнага становішча.

в) Больш шырока практыкаваць прагрэсіўна - прэміяльную зьдзельшчыну.

5. У галіне барацьбы з «абязьлічкай».

Барацьба з «абязьлічкай» у прамысловасьці павінна стаць важнейшым элементам у практычных мерапрыемствах па рэалізацыі дырэктыў тав. Сталіна. Для чаго правесьці наступнае:

а) Зараз-жа разгарнуць шырокую работу па выпуленьні усіх элементаў «абязьлічкі», абсталяваньня і майстроў, прыцягнуўшы да гэтай справы шырокія масы рабочых, забясьпечыўшы поўнае выпуленьне і ліквідацыю «абязьлічкі» не пазней, чым да 20 жніўня.

б) Прадпрыемствам, якія працуюць на тры зьмены, не пазней, чым да 10-га жніўня, ліквідаваць «скользящую» групу рабочых шляхам увядзеньня такога графіку рабочага дня, які поўнасьцю прадугледжвае ліквідацыю «скользящей» групы.

в) Партарганізацыям прадпрыемстваў больш адпаць увагі пытаньням арганізацыі працы на прадпрыемствах.

6. Сакратарыят гаркому лічыць зусім шкодным і правааапартуністычным імкненьні, якія ёсьць у радзе месц, да ліквідацыі бесьперапынкі бяз усякіх для гэтага падстаў і гаспадарчай мэтазгоднасьці.

Бесьперапынка, якая праведзена ў большасьці прадпрыемстваў Савецкага Саюзу, зьяўляецца важнейшым сродкам для забясьпячэньня шпарэйшэйшаго сацыялістычнага будаўніцтва.

Сакратарыят гаркому катэгарычна забараняе перавод прадпрыемстваў на перапынку бяз санкцыі ўрадавых органаў.

Перавод на перапынку дазволіць толькі ў выпадку поўнай немагчымасьці правільна арганізаваць працу ў сучасны момант і ліквідаваць «абязьлічку» пры бесьперапынцы.

На чарговым пасяджэньні бюро гаркому абгаварыць пытаньне аб пераходзе на перапынку прадпрыемстваў з адной і дзьвюма зьменамі.

7. Вопыт работы вытворчых камун на радзе прадпрыемстваў гораду Менску сьведчыць, што гэта важнейшая форма сацыялістычнай працы пры правільным кіраўніцтве і правільным падыходзе да іх арганізацыі цалкам сябе апраўдалі. Сакратарыят гаркому лічыць абсалютна недапушчальнымі ўсялякія разважаньні аб ліквідацыі камун нават і тых, якія сябе цалкам апраўдалі і забясьпечылі высокі рост прадукцыйнасьці працы.

8. Для практычнай дапамогі вытворчым ячэйкам у рэалізацыі дырэктыў тав. Сталіна мабілізаваць на 5 дзён 75 адказных партыйных, гаспадарчых і прафэсыянальных работнікаў. Даручыць арганізаваць правесьці гэту мабілізацыю.

Гародніну пралетарскім цэнтрам

На пасяджэньні апэрацыйнага штабу

26 ліпеня пры газэце «Рабочий» адбылося чарговае пасяджэньне апэрацыйнага штабу барацьбы за гародніну для пралетарскіх цэнтраў. Высьветлілася, што, ня гледзячы на пастанову Менгарсавету аб своячасовай падрыхтоўцы хавалень для гародніны, Белжылсаюз і Менгаржылсаюз да гэтага часу нічога канкрэтнага не зрабілі. Замест таго, каб неадкладна арганізаваць брыгады па выяўленьні будынкаў, у жактах, якія можна было-б скарыстаць пад хавальні, гэтыя арганізацыі зусім не клапоцяцца аб забясьпячэньні гародніной рабочых цэнтраў.

Дагэтуль яшчэ невядома, колькі патрэбна жактаўскім сталоўкам гародніны. Менгаржылсаюз нічога не зрабіў для высьвятленьня гэтай справы і ня можа даць пэўнай заўкі на гародніну для сталовак жактаў.

У крамы дробнага продажу гародніна прывозіцца і разьмяркоўваецца зусім няправільна, бясплянава. Белкаапгародніна ў свае крамы дасылае гародніны значна больш, чым патрэбна, а ў іншыя зусім мала. У выніку капя апошніх стараюцца вялікія чаргі. Апэрацыйны штаб рашуча асудзіў гэтыя дзеяньні Белкаапгародніны, як бяспрынцыпнае дзяльцтва.

З тарай усё яшчэ справа стаіць дрэнна. Ня гледзячы на рад пастаноў гарсавету і іншых арганізацый, тара для перавозкі гародніны ня зьбіраецца. Гэтай справе неагул не аддаецца ніякай увагі.

Стан хавалень для гародніны на базе МЦРК проста пагражаючы. Ад кожнага дажджу ў хавальні цячэ шмат вады. Зусім зразумела, што пры такім становішчы хавальні ня могуць быць скарыстаны. Іх неабходна адрамантаваць, бо інакш гародніна будзе там гніць. Аднак, меры для рамонту нікім ня прымаюцца.

Штаб пастанавіў 28 ліпеня арганізаваць рэйд брыгад з удзелам газэт «Рабочий» і «Зьвязда», ЦКПСБ, РСІ і Менскай пракуратуры для дэтальнага выяўленьня становішча падрыхтоўкі хавалень —а.

АД САМАЦЁКУ

да арганізаванага набору рабочай сілы

НЕАДКЛАДНА ПЕРАБУДАВАЦЬ РАБОТУ ОРГАНАЎ ПРАЦЫ, ВЫХОДЗЯЧЫ З НОВЫХ ЗАДАЧ ВЯРБОЎКІ І ПАДРЫХТОЎКІ КАДРАЎ

НА НАРАДЗЕ РАБОТНІКАЎ ОРГАНАЎ ПРАЦЫ ПРЫ НКПБ

Высокія тэмпы сацыялістычнага будаўніцтва забясьпечылі рост матар'яльна-тэхнічнага ўзроўню рабочай клясы, ліквідацыю беспрацоўя. Пытаньне аб вярбоўцы рабочай сілы для прамысловасьці ў сувязі з ліквідацыяй беспрацоўя набывае зараз выключна важнае значэньне. Прамова тав. Сталіна на нарадзе гаспадарнікаў па-новаму паставіла перад органамі Наркампрацы, перад органамі працы гаспадарчых арганізацый пытаньне аб вярбоўцы і замацаваньні рабочай сілы, аб арганізацыі працы, заработнай плаце, абароне бытавых умоў і г. д.

У рэалізацыі высунутых у прамове тав. Сталіна прапаноў органы працы БССР яшчэ не дасягнулі значных посьпехаў.

Дабіцца пералому ў гэтым, вызначыць канкрэтныя шляхі перабудовы сваёй работы і мае на ўвазе нарада работнікаў сэктараў кадраў, эканомікі працы і плянавых работнікаў цэнтральных устаноў усіх галін народнай гаспадаркі, якая адкрылася 26 ліпеня пры Наркампрацы БССР.

Тав. Басін у сваім дакладзе прывёў факты, якія сьведчаць аб тым, што да гэтага часу ў справе вярбоўкі рабочай сілы існуе поўны самацёк. Гэта прывяло да таго, што на радзе галін прамысловасьці назіраецца значны недахват рабочых: па хэмічнай прамысловасьці — 15 проц., па мэталапрапрацоўчай — 14 проц. і г. д. у той час, як у іншых галінах прамысловасьці ёсьць лішкі рабочых: па шэйнай—4,2 проц., гарбарна-абутковай — 3 проц. і г. д. Пры вучоце фактычнага выкананьня пляну і норм вытворчасьці па прамысловасьці БССР ёсьць 11,3 проц. лішкаў. Такая несуадпаведнасьць тлумачыцца вылучна дрэннай пастаноўкай арганізацыі працы, адсутнасьцю мабілізаванай рабочай сілай і правільнай не расстаноўкі.

Асабліва слаба забясьпечаны рабочай сілай сяўленыя галіны прамысловасьці. Сярэдняя забясьпечанасьць вярбоўкі прамысловасьці тэрмінамі складае 86,3 проц. (вярбоўка—96,3 проц. Забясьпячэньне рабочай сілай па пасэйным і шляхава-жалезным буданіцтве складае ў сярэднім 50 проц.

Адсутнасьць правільнай пастаноўкі вярбовачнай работы і арганізаванага забясьпячэньня рабочай сілай, а таксама адсутнасьць уліку працоўных рэсурсаў у калгасах і аднаасобным сэктары зьяўляецца галоўнай прычынай такога становішча.

Асноўнай крыніцай вярбоўкі рабочай сілы для прамысловасьці зьяўляюцца калгасы. У калгасах ёсьць вялікія рэзервы вольнай рабочай сілы, якая праз дагаворную сыстэму павінна быць замацавана за прамысловасьцю. Адны органы Наркампрацы ня справяцца з гэтай работай. У дапамогу ім павінна прыйсьці прамысловасьць, якая да гэтага часу лічыла не сваёй справай вярбоўку рабочай сілы. Трэба наладзіць пастаянную сувязь паміж гаспадарчымі органамі і раённымі калгаснымі цэнтрамі такім чынам, каб усе пытаньні, зьвязаныя з адыходніцтвам, рэгуляваліся прамысловасьцю, калгаснай сыстэмай і органамі працы, каб прамысловасьць не абмяжоўвалася толькі дачай заявак, а прымала ўдзел ва ўсіх этапах работы. Прамысловасьць павінна ня толькі арганізаваць прыёмку рабочай сілы, але і першапачатковую падрыхтоўку яе на мясцох. Падрыхтоўка рэзерваў для пэўных галін прамысловасьці павінна ісьці праз арганізацыю вучэбных пунктаў, майстэрань, школ ФЗВ пры саўгасах, МТС і буйных калгасах.

Трэба правесьці прымацаваньне сельсаветаў і калгасаў да пасобных гаспадарчых аддзелаў. Гэтую работу, як прапанаваў наркампрацы тав. Басін, трэба скончыць да 1 верасьня, выявіўшы ў 15-дзенны тэрмін усе магчымасьці для ўкамплектаваньня рабочымі тарфяной прамысловасьці. Выкананьне і вярбоўку рабочай сілы з працоўных гораду кіраўніцтва гарадзкімі кадрамі павінна праводзіць праз сыстэму жактаў і фабрычна-заводзкія прафарганізацыі. На аснове дакладнага уліку мінімальна праводзіць заключэньне дагавораў паміж гаспадарчымі органамі і жактамі на вярбоўку рабочых, а таксама на іх падрыхтоўку.

Ураўнілаўка ў заработнай плаце—перашкода ў вярбоўцы кваліфікаваных кадраў. Да гэтага часу не ўстаноўлена правільная тэрыфікацыя. На бабруйскім дрэваапрацоўчым камбінаце чорнарабочы другога разраду атрымлівае больш за токара другога разраду і г. д.

Пры непасрэднай дапамозе прафсаюзных арганізацый органы працы над кіраўніцтвам партыі павінны неадкладна ўзяцца за поўную перабудову сваёй работы.

Асабліва ўвага павінна быць зьвернута на культурнае і бытавое абслугоўваньне новых кадраў рабочых. Той гаспадарнік і прафработнік, які не клапоціцца аб культурным і матар'яльна-бытавым абслугоўваньні рабочых, і ў першую чаргу новых кадраў, не разумее прычыны плыўкучасьці, той нездольны замацаваць рабочую сілу і забясьпечыць вярбоўку патрэбных кадраў.

Нарада, якая зараз праходзіць, вырашыць канкрэтныя мерапрыемствы па хутчэйшай перабудове работы органаў працы, што забясьпечыць больш хуткую рэалізацыю прапаноў аб арганізацыі вярбоўкі рабочай сілы, якія (прапановы) вызначаны ў прамове правадыра партыі—тав. Сталіна.

ЗАЎЖДЫ ГАТОВЫ

Усебеларускі зьлёт юных піянэраў

Раніцой 26 ліпеня прасторная заля галоўнага корпусу унівэрсытэцкага гарадка была запоўнена энэргічнай гутаркай, бадзёрымі песьнямі і бурнымі хвалямі жыцьцярадаснага юнацкага сьмеху. Сюды сабраліся дэлегаты другога ўсебеларускага зьлёту піянэраў, каб распачаць першае пасяджэньне сваёй канфэрэнцыі.

З-за спазьненьня пачатку пасяджэньня дзесяткі юнакоў-дэлегатаў гучным калектыўным патрабаваньнем выказвалі сваю нецярплівасьць:

— ПА-РА ПА-ЧЫ-НАЦЬ!..

Нарэшце, канфэрэнцыя пачалася:

Слова для дакладу ЦВ ДКА аб становішчы піянэрскай арганізацыі і далейшых яе задачах мае тав. Гайдукевіч:

— Камуністычная партыя і рабочая кляса аддаюць вялізарную ўвагу справе камуністычнага выхаваньня падрастаючага пакаленьня, выхаваньня зьмены, здольнай пабудаваць сацыялізм.

Буржуазія ўсіх краін, імкнучыся пазбавіцца ад нявылечнай хваробы—сусьветнага эканамічнага крызісу,—шукае сабе ратунку ва ўзмоцненай эксплёатацыі рабочых і іх дзяцей. Галадоўка, жабрацтва і непамерна цяжкая праца 10-12-гадовых юнакоў—вось што характарызуе становішча мільёнаў дзяцей працоўных па той бок чырвонай мяжы.

За два гады з часу першага ўсебеларускага зьлёту дзіцячая камуністычная арганізацыя Беларусі пад кіраўніцтвам партыі і камсамолу дабілася значных посьпехаў у барацьбе за сацыялізм. Дзеці рабочых разам з рабочай клясай прымаюць актыўны ўдзел у сацыялістычным будаўніцтве.

У гэтай барацьбе выхоўваецца надзейная бальшавіцкая зьмена.

Падрыхтоўка да зьлёту паказала, як піянэры Беларусі канкрэтнай практычнай работай дапамагаюць партыі ажыцьцяўляць гістарычныя задачы.

Піянэрбаза заводу «Чырвоны мэталіст» шляхам правядзеньня па заводзе мітынгаў, арганізацыі бюлетэню, чырвонай і чорнай дошкі, ўкараненьня ў пэхі заводу сацыялістычных мэтадаў работы прыпіла да зьлёту з наступнымі вынікамі: электразварачны цэх абазваў сябе ўдарным імя другога ўсебеларускага зьлёту піянэраў і з посьпехам выконвае свой праграмны плян. Рад атрядаў Віцебску дабіўся 100 проц. замацаваньня на заводзе сваіх бацькоў да канца пяцігодкі.

— Значных посьпехаў дасягнулі вясковыя піянэры. Яны штодзённа эмацаюцца зь калектывізацыяй, за ажыцьцяўленьне плянаў важнейшых гаспадарча-палітычных кампаній. Маленькі прыклад:

Саўгас Жылічы. Урывак з дзеньніка піянэратраду.

... 10 чэрвеня. Суботнік. 13 піянэраў палолі саўгасныя буракі.

12 чэрвеня. Чэтыры піянэры пчолі цыкорыю, шэсьць—працавалі ў саўгасе на іншых работах, іншыя чысьцілі інвэнтар.

14 чэрвеня. Чэцьвёра працавалі ў саўгасе. Двое—дапамагалі рамантаваць трактар...

— Ёсьць і недахопы:

Яшчэ невыстарчальна піянэрская работа падпарадкавана задачам прамф

Год выданьня—XV
№ 202 (4107)
АЎТОРАК, 28 ЛІПЕЯ 1931
Цана нумара 5 кап.
Выходзіць
БЕСЬПЕРАПЫННА

ЗЬВЯЗДА

Орган ЦК Мен. Гаркому Камуністычнай партыі (б) Беларусі

РЭДАКЦЫЯ І КАНТОРА
МЕНСК, СВЕРЦЕЙКІ, 63.
Тэлефоны:
рэдактар—4-27,)— сакратар—10-74, партсэктар—12-80, прамысл.—12-50, сан. эвід.—6-19, мясц. інфарм.—6-19, замеж. інфарм.—6-19, навны рэдактар—6-42, кніга-водная інфармацыя—16-74, канторавыдача—6-19, рэдактэлефон—7-41

Усе на абарону БССР, усе ў рады Асоавіяхіму

Да працоўных БССР

І жніўня рабочыя і працоўныя ўсяго сьвету выйдуць пад чырвонымі сьцягамі камуністычнага інтэрнацыяналу дэманстраваць **супроць падрыхтоўкі вайны, супроць крывавай бойні, супроць нападу на СССР.** Яшчэ ніколі капіталістычны сьвет не перажываў такога эканамічнага крызісу, як зараз. Закрываюцца фабрыкі і заводы, банкратуюць балкі, дзесяткі мільёнаў працоўных выкінуты на галодную сьмерць. Многа дзесяткаў мільёнаў старых і дзяцей, дарослых мужчын і жанчын асуджаны на голад і холад.

Капіталісты і абшарнікі ўсяго сьвету разам з сацыял і нацыянал-фашыстамі хочуць выйсьці з гэтага крызісу шляхам яшчэ большага націску на рабочую клясу, шляхам яшчэ большай эксплёатацыі працоўных, шляхам нападу на бацькаўшчыну працоўных усяго сьвету — СССР.

«Кожны раз, калі капіталістычныя супярэчнасьці пачынаюць абвастрацца, буржуазія зварочвае свае вочы ў бок СССР, **каб вырашыць тую ці іншую** супярэчнасьць капіталізму, або ўсе супярэчнасьці, разам узятыя, за кошт СССР —краіны саветаў—цытадэлі рэвалюцыі, якая адным сваім існаваньнем рэвалюцыянізуе рабочую клясу капіталістычных краін і калёніі» (Сталін).

Толькі ў СССР няма ніводнага беспрацоўнага. З кожным днём расьце і мацнее наша сацыялістычная гаспадарка. Мы з посьпехам завяршаем пабудову фундаманту сацыялістычнай эканомікі ў трэцім рашаючым годзе пяцігодкі. Пяцігодка выконваецца за чатыры гады, а па некаторых вучастках прамысловасьці—за тры і нават два з паловай гады. З кожным годам усё больш паляпшаецца добрабыт рабочых і працоўных мас. Больш паловы сялянскіх гаспадарак уступіла на шлях сацыялістычнай перабудовы сельскай гаспадаркі. Правільная палітыка партыі забясьпечыла рашучы і канчатковы паварот серадняцкіх мас да сацыялізму. Магутны калгасны рух ахапіў мільёны сялянскіх гаспадарак, стваравучы новыя суадносны клясавых сіл у краіне, ператвараючы серадняка, які ўступае ў калгас, у апору савецкай улады, стваравучы ўмовы для зьмены кулацкага вытворчага збожжа-вытворствам саўгасаў і калгасаў. Ліквідуецца на аснове супольнай калектывізацыі кулацтва як кляса.

З краіны, якая ў мінулым зьяўлялася турмой народаў, СССР стала свабодным саюзам свабодных сацыялістычных рэспублік.

ВССР з краіны прыгнечанай царызмам, эканамічна адсталай, цёмнай, няпісьменнай становіцца краінай супольнай пісьменнасьці, з дзесяткамі вышэйшых навучальных устаноў, сотнямі і тысячамі школ на роднай мове. Сотні тысяч экзэмпляраў газэт, дзесяткі тысяч рабселькораў, сотні фабрык і заводаў, дзесяткі МТС — амаль палова сялянскіх гаспадарак, аб'яднаных у калектыўныя гаспадаркі, — вось вынікі разьвіцьця Савецкай Беларусі пад кіраўніцтвам камуністычнай партыі.

Жорсткі эканамічны крызіс у капіталістычных краінах, буйны рост сацыялістычнага будаўніцтва СССР—бацькаўшчыны працоўных усяго сьвету—уздымае на барацьбу мільёны працоўных капіталістычных краін і калёній. Працоўныя Нямеччыны, Польшчы, Англіі, Гішпаніі, Амэрыкі, Францыі, Індыі, Кітаю, ня гледзячы на шалёны тэрор, з кожным днём усё энэргічней змагаюцца за сваімі прыгнятальнікамі, будуюць барыкады, мільёны працоўных Кітаю змагаюцца за сваю савецкую ўладу.

Шляхам тэрору, забойства, карных экспэдыцый капіталісты і прыгнятальнікі ўсяго сьвету хочуць задушыць працоўных, якія падымаюцца на барацьбу. Сотні тысяч лепшых барацьбітоў запаўняюць турмы капіталістычных краін.

Чым больш расьце крызіс у капіталістычных краінах, чым больш расьце рэвалюцыйны ўздым працоўных усяго сьвету, тым больш расьце тэрор супроць працоўных, **тым больш набліжаецца небясьпека вайны,** у першую чаргу напад на СССР.

Працэсы прампартыі, меншавікоў, ліхаманкавае ўзбраеньне капіталістычных краін, пабудова стратэгічных чыгунак і шасэйных дарог, рост ваенных заводаў, высяленьне з прымежных месц Заходняй Беларусі рэвалюцыйных рабочых і сялян—паказвае на ўзмацненьне тэмпаў падрыхтоўкі інтэрвэнцыі супроць СССР.

Канфэрэнцыя прадстаўнікоў буйнейшых капіталістычных краін у Лёндане, каб «ратаваць» капіталістычную Нямеччыну перад пагрозай пралетарскай рэвалюцыі—згаварыліся, каб знайсьці выхад за кошт СССР.

Капіталісты, абшарнікі хочуць пагнаць мільёны працоўных на вайну супроць сваіх братоў, супроць Савецкага Саюзу.

Ва ўсёй гэтай агідной рабоце самым першым дапаможнікам капіталістаў і абшарнікаў зьяўляюцца сацыял і нацыянал-фашысты. Аб гэтым гаварыў працэс меншавікоў, аб гэтым гаворыць штодзенная работа меншавікоў усяго сьвету. Яны, прыкрываючыся сваімі пацыфісцкімі фразамі, хочуць пакіравець брата супроць брата і ў першую чаргу супроць Савецкага Саюзу, але-ж працоўныя ўсяго сьвету добра памятаюць сусьветную бойню, на якой было **забіта 10.000.000 чал., пакалечана 19.000.000 чал., засталіся мільёны ўдоў і сірот.**

Рэвалюцыйныя рабочыя і сяляне ўсяго сьвету выйдуць на вуліцу ў дзень і жніўня, ня гледзячы на тое, што супроць іх мабілізуецца паліцыя, войска, і сацыял-фашысцкія банды.

Яны будуць дэманстраваць гатоўнасьць да барацьбы супроць вайны, супроць голаду, супроць тэрору ў абарону Савецкага Саюзу.

Таварышы рабочыя, работніцы, калгасьнікі, калгасьніцы і працоўныя! Мы павінны заўсёды памятаць аб надыходзячай ваеннай небясьпецы, якая пагражае зрыву сацыялістычнага будаўніцтва. Мы павінны ўсімі сіламі рыхтавацца да абароны.

Палітыка савецкай улады — гэта палітыка міру. Мы ня хочам вайны, але мы павінны быць гатовы заўсёды да абароны. Мы будзем узмацняць абарону савецкай краіны шляхам ажыўленьня і разгортваньня работы Асоавіяхіму, шляхам сталай дапамогі ў абароназдольнасьці Чырвонай арміі. Будзем узмацняць абарону бацькаўшчыны сусьветнага пралетарыяту выкананьнем і перавыкананьнем прамфінпляну, поўнасьцю рэалізуем пазыку «3-ці рашаючы год пяцігодкі», па-баявому правядзем уборачную, загатоўчую кампанію і асеньнюю сяўбу, памятаючы, што СССР зьяўляецца «ударнай брыгадай міжнароднага пралетарыяту».

Ні на хвіліну не забудзем аб нашых братох, якія змагаюцца за вызваленьне рабочае клясы, якія дзесяткамі тысяч пакутуюць на выспах і катаржных турмах у краінах капіталу. Ні на хвіліну не забудзем пакінутых без дапамогі жонак і дзяцей палітзьняволеных, якія таксама пакутуюць і галадаюць. Мы будзем ўзмацняць работу па інтэрнацыянальным выхаваньні працоўных мас. Мы будзем узмацняць рады МОПР'у.

Працоўная моладзь! Пад сьцягам камуністычнай партыі напружвай свае сілы для сацыялістычнага будаўніцтва! Будзь гатоў да абароны СССР!

Дамо Чырвонай арміі стойкае, клясава-вытрыманае, фізічна-здаровае папаўненьне!

Працоўныя жанчыны! Толькі дыктатура пралетарыяту дае поўнае разьняволеньне жанчыны. Арганізуйцеся для барацьбы за сацыялістычнае будаўніцтва! Пратэстуйце супроць крывавых плянаў капіталізму, супроць новых імпэрыялістычных войн! Узмацняйце абароназдольнасьць СССР!

Шчыльней рады вакол ленінскай камуністычнай партыі!

З посьпехам перавыканаем народнагаспадарчы плян 3-га рашаючага году пяцігодкі!

Усе на абарону СССР, усе ў рады Асоавіяхіму!

Узмацнім дапамогу палітзьняволеным і іх сем'ям. Шчыльней згуртуем рады МОПР'у!

Няхай жыве СССР — сацыялістычная бацькаўшчына працоўных і прыгнечаных усяго сьвету!

Далоў імпэрыялістычныя войны!

Няхай жыве сусьветная рэвалюцыя!

Няхай жыве Камінтэрн — штаб сусьветнай рэвалюцыі!

Цэнтральны Савет Прафсаюзаў Беларусі.
Цэнтральны Савет Асоавіяхіму.
Цэнтральны Камітэт МОПР'у.

Разьвіць мясцовую прамысловасьць

(*З пастановы СНК БССР*)

Заслухаўшы даклад ВСНГБ пра вынікі абсьледваньня мясцовай прамысловасьці, СНК БССР адзначыў, што побач са значным разгортваньнем мясцовай прамысловасьці за апошнія гады ёсьць і рад недахопаў. З мэтаю зьнішчэньня апошніх і забесьпячэньня нармальнага разьвіцьця мясцовай прамысловасьці СНК прызнаў необходным правесьці наступныя мерапрыемствы:

Для максымальнага разгортваньня мясцовай прамысловасьці на базе мясцовага сырцу накіраваць далейшае разьвіцьцё яе (мясцовай прамысловасьці) па лініі, галоўным чынам, **пераходу на выраб новых відаў будаўнічых матар'ялаў, аазьвіцьця торфпрамысловасьці і арганізацыі вытворчасьці па перапрацоўцы тельска-гаспадарчых прадуктаў.**

У раёнах са значнай колькасьцю прадпрыемстваў керамічнай вытворчасьці прапанаваць арганізаваць **паасобныя кіраўніцтвы** гэтымі прадпрыемствамі, якія павінны знаходзіцца на гаспадарчым разьлікуку з правамі раённых камбінатаў.

Для забесьпячэньня поўнага і сапраўднага кіраўніцтва мясцовай прамысловасьцю СНК БССР прызнаў необходным у раёнах з разгорнутай прамысловасьцю ўкамплектаваць **плянавыя часткі РВК і гарадзкіх саветаў у адпаведнасьці з зацьверджанымі штатамі.** На райвыканкомы і гарадзкія саветы ўскладзена зацьвярджэньне, назначэньне і звальненьне дырэктароў паасобных прадпрыемстваў. Сэктар мясцовай прамысловасьці ВСНГБ рэарганізаваць у самастойнае кіраўніцтва, надпраўкаванае прэзыдыуму ВСНГБ на тыпе рэспубліканскага аб'яднаньня, усклаўшы на гэтае кіраўніцтва побач з плянаваньнем таксама і фукцыі тэхнічнага кіраўніцтва.

Для забесьпячэньня пасьпяховага выкананьня прамфінпляну па мясцовай прамысловасьці СНК БССР прызнаў неабходнымі:

а) каб райвыканкомы і гарадзкія саветы поўнасьцю забясьпечылі канчатковы перавод прадпрыемстваў на гаспадарчы разрахунак і на працягу двох месяцаў перавялі буйныя цэхі, надаўшы прадпрыемствам поўную гаспадарчую самастойнасьць;

Лічачы асобнай баявой задачай разьвіцьцё ў бліжэйшыя гады ў БССР выробку клінкеру, які павінен зьяўляцца адным з асноўных матар'ялаў для брукаваньня вуліц і дарог і мае поўную сыр'ёвую базу,—СНК абавязаў ВСНГ **да 1 жніўня гэтага году скончыць дасьледчыя работы і тэхнічна-эканамічнае ўгрунтаваньне пабудовы клінкерных заводаў у Лоеве, Чэрыкаве і каля Менску.** Менскі гарадзкі савет і Галоўдэртранс СНК абавязаў **у гэтым-жа годзе закласьці фундамант двох новых клінкерных заводаў** з тым, каб гэтыя заводы ў 1932 годзе маглі даць ня менш 5 млн. штук клінкеру.

СНК абавязаў ВСНГ і Галоўдартранс ужо ў гэтым годзе заключыць дагаворы з адпаведнымі машынабудаўнічымі заводамі на патрэбнае абсталяваньне ня менш, як **для 4-х клінкерных заводаў.** Галоўкамгасу і Галоўдартрансу даручана ў пэрспэктыўных плянах будаўніцтва шляхоў і брукаваньня вуліц улічыць максымальнае скарыстаньне клінкеру.

Геалёгічнаму інстытуту разам з ВСНГ і Галоўдартрансам даручана на працягу 1931 і 1932 гадоў скончыць поўнае **адшуканьне і дасьледваньне месцазнаходжэньня клінкерных глін у БССР, джаньня клінкерных глін у БССР,** вамі разьвіцьця камунальнай гаспадаркі і дарожнага будаўніцтва.

У ФАШЫСЦКАЙ ПОЛЬШЧЫ

Масавыя арышты ў Варшаве працягваюцца

ВАРШАВА, 25. Хваля арыштаў, якая распачалася ў сувязі з набліжэньнем 1 жніўня, бесьперапынна ўзмацняецца. Фашысцкі ўрад імкнецца гэтым стэрарызаваць рабочую клясу і не дапусьціць да выступленьняў у дзень 1 жніўня. Фашысцкі друк паведамляе аб новых арыштах, якія былі праведзены аханкай 23 ліпеня. АРЫШТАВАНА 6 АСОБ.

Жорсткая расправа фашысцкага суда

ВІЛЬНЯ, 25. У Віленскім акруговым судзе ў мінулым годзе разглядалася справа **М. Кагановіч і Р. Троцкага** па абвінавачваньні ў камуністычнай дзейнасьці. На падставе паказаньняў шпіёкоў і паліцэйскіх абвінавачаныя былі **прысуджаны да шматгадовай катаргі.**

Апэляцыйны суд прыгавор акруговага суда зацьвердзіў. У часе агалашэньня прыгавору абвінавачаны **Р. Троцкі** дэманстрацыйна ўсклікнуў **«прэч фашысцкі суд»!** За гэты воклич пракурор прыцягнуў Троцкага да судовай адказнасьці. Акруговы суд, які разглядаў гэсу справу, **засудзіў абвінавачанага да 1½ году турмы.** Апэляцыйны суд прыгавор гэты зацьвердзіў.

Капіталістычныя акулы ўзмацняюць эксплёатацыю

ВАРШАВА, 25. Польскія капіталісты **пачалі жорсткую атаку на зарплату рабочых.** Як паведамляе сацыял-фашысцкі «Роботнік», прадпрыемцы чыгунна-ліцейных заводаў Верхняй Сілезіі высунулі патрабаваньне **зьніжэньня зарплаты на 30 проц.**

У сувязі з гэтым, на ўсіх заводах пануе **вялікае абурэньне. Рабочыя энэргічна рыхтуюцца да забастоўкі.**

Звальненьне 10.000 служачых

ВАРШАВА, 25. Як паведамляе фашысцкі друк галоўнае праўленьне сацыяльнага забесьпячэньня звальняе з 31 ліпеня ўсіх служачых, якія працуюць у бальнічных касах, а таксама ва ўсіх установах сацыяльнага забесьпячэньня. Лічба звольненых перавышае **10.000 асоб.** Сярод служачых пануе **нябывалае абурэньне.**

Катастрафічны ўпадак зямляробства

ВАРШАВА, 25. Інстытут досьледу гаспадарчых кан'юнктур падае цікавыя даныя, якія датычаць спажываньня штучных угнаеньняў у сёлетнім веснавым сэзоне.

Спажываньне азоту зьменшылася на 42 проц. у адносінах да 1929-30 г. і **на 59 проц.** у адносінах да 1928-29 г.; зьмяншэньне спажываньня паташовых угнаеньняў вызначылася **ў 48 проц. і 57 проц.,** зьмяншэньне фосфару—**36 проц. і 51 проц.**

Агульны кошт спажытых угнаеньняў у 1930-31 г. раўняецца толькі **52 проц.** кошту спажытых у 1929-30 годзе і **38 проц.** кошту спажытых у 1928-29 г. Гэта значыць, што **на працягу двух год спажываньне штучнага ўгнаеньня зьменшылася на 4/5 і ў гэту вясну ледзь склала 1/5 частку колькасьці спажытай два гады наму назад.**

Гэтыя даныя неабвержна сьведчаць аб **катастрафічным упадку зямляробства ў фашысцкай Польшчы, якое з прычыны слабай тэхнікі ня можа канкураваць на сусьветным рынку.**

Пабег б. камуністычнага пасла т. Вечорка

ВАРШАВА, 25. 22 ліпеня са станцыі Катавіцы ўцёк былы камуністычны пасол тав. **Вечорэк,** якога па загаду фашысцкіх улад паліцыя перавозіла з катавіцкай турмы ў Вронкі.

Тав. Вечорэк за пасольскую дзейнасьць быў выданы польскім соймам пры дзейнай дапамозе сацыял-фашыстаў фашысцкаму суду, які прыгаварыў яго да **двух год** катаргі.

Банкрутства вялізарнай фірмы ў Польшчы

ВАРШАВА, 22. Як паведамляе фашысцкі друк, 21 ліпеня **збанкрутавалі ў Лодзі вялізарнейшыя на ўсю Польшчу тэкстыльныя прадпрыемствы «Відзэўская мануфактура».** Банкрутства гэтай фірмы сьведчыць аб **надзвычайным завастрэньні эканамічнага крызісу ў фашысцкай Польшчы.**

„ГОНАР МУНДЗІРУ"

26-га ліпеня «Зьвязда» ў рэдакцыйным артыкуле «Пашырыць вопыт Ельскага раёну» пісала:

«Цэнтральныя газэты БССР, асноўная масе якіх правяла значную ініцыятыўную работу па падрыхтоўцы да зьезду («Рабочий», «Савецкая Беларусь», «Рабселькор», «Калгасьнік Беларусі», «Акцябр», у мекшай мерэ—«Чырвоная Зьмена», «Юнэр Арбэйтэр», «Орка», «С.-г. рабочы Беларусі» і г. д.) павінны разам з раённымі і гарадзкімі камітэтамі КП(б)Б, разам з рэдакцыямі раённых газэт узначаліць усю далейшую работу па перабудове рабселькораўскага руху, узмацненьні сеткі насьценных газэт і забесьпячэньні пасталяніага партыйнага кіраўніцтва гэтымі вучасткамі работы».

Рэдакцыя «Чырвонай Зьмены» да самага апошняга часу наперакор элемэнтарным прынцыпам партыйна-савецкага друку ўпарта праходзіла мімо тых аглядаў, якія непасрэдна закраналі яе работу. Проста, напэўна, таварышы з «Ч. З.» забылі аб самакрытыцы.

Але, як кажуць, няма правіл без выключэньняў. На гэты раз «Чырвоная Зьмена» парушыла сваё маўчаньне. Ва ўчарашнім нумары «Ч. З.» зьмешчаны рэдакцыйны артыкул «Наш карэктывы ў «Замест агляду друку» «Зьвязды», дзе, між іншым, гаворыцца:

«Мы маглі-б не супярэчыць супроць агляду «Зьвязды», — піша «Чырвоная Зьмена», — у якім правільная крытыка нашых недахопаў дасягала-б хаця 20 проц. (???), але пакідаць бяз увагі ні на чым неабгрунтаваныя сьцьверджаньні мы ня можам.

Мы адвяргаем тое, што «Чырвоная Зьмена» «у меншай меры, чым іншыя газэты вяла падрыхтоўку да рабселькораўскага зьезду».

Далей рэдакцыя «Чырвонай Зьменны» падае довады ў пацьверджаньне правільнасьці свайго пратэсту, прычым дапускае недапушчальныя выбрыкі ў адносінах да «аўтара агляду», г. зн. да ЦО КП(б)Б — «Зьвязды» (кожны наш агляд ёсьць рэдакцыйны артыкул).

У адказ «Чырвонай Зьмене» падаём дзьве фактычныя даведкі:

Першая даведка. 5 мая «Зьвязда» ў агляде друку, апісываючы работу цэнтральных газэт БССР па правядзеньні масавага агляду-самаправеркі нізавога друку — арганічнай часткі падрыхтоўкі да 2-га ўсебеларускага зьезду рабселькораў,—пісала:

«Чырвоная Зьмена» зьяшчае 4 красавіка пастанову сакратарыяту ЦК КП(б)Б аб самаправерцы-аглядзе (нізавога друку. Рэд.) і камэнтуе яе ў перадавым артыкуле пад назвай «Баявая задача».

Гэты перадавы артыкул ні адным словам ня высоўвае практычных задач перад юнкорамі ў галіне масавай работы ў сувязі з самаправеркай.

Абмежаваўшыся адным перадавым артыкулам, газэта «Чырвоная Зьмена» фактычна поўнасьцю замоўчвае тую вялікую работу, якая паводле пастаноў ЦК КП(б)Б зараз праводзіцца ў галіне друку».

Рэдакцыя «Ч. З.» і па сёньняшні дзень на гэты агляд зусім не адгукнулася. Адсюль выцякае лёгічны вывад, што «Чырвоная Зьмена» згадзілася з абвінавачаньнем, прад'яўленым ёй у аглядзе «Зьвязды». Як гаворыцца, супроць фактаў ня пойдзеш.

Другая даведка. Напярэдадні зьезду рабселькораў БССР прэзыдыум Менскай гарКК КП(б)Б апублікаваў пастанову аб рэзультатах рэйду па праверцы падрыхтаванасьці да 2-га ўсебеларускага рабсельвасенкораўскага зьезду. У гэтай пастанове гарКК КП(б)Б, між іншым, ёсьць наступны пункт:

«...Рэдакцыі цэнтральных газэт «Чырвоная Зьмена» і, у асабліваści «Раўдонасіс Артэкіс», да гэтага часу НЕ ЗАБЯСЬПЕЧЫЛІ РАЗГОРТВАНЬНЯ СЫСТЭМАТЫЧНАЙ ПАСЬЛЯДОЎНАЙ ПАДРЫХТОЎЧАЙ РАБОТЫ ДА ЗЬЕЗДУ» (падкрэсьлена намі. Рэд.).

І так, на парозе зьезду, як канстатуе прэзыдыум гарадзкой кантрольнай камісіі КП(б)Б, «Чырвоная Зьмена» не забясьпечыла «разгортваньня сыстэматычнай і пасьлядоўнай падрыхтоўкі да зьезду рабселькораў».

«Чырвоная Зьмена» пекальці іншай думкі. Яна з свавольным бахвальствам піша, што:

«...«Чырвоная Зьмена», якая ў радзе іншых пытаньняў дае прыклад баявой арэрацыйнай работы,—і ў гэтай справе паказвае ня дрэнныя ўзоры арэрацыйнай дзейнасьці...»

Здаецца ўсё ясна. Ужо толькі адны гэтыя даведкі дазваляюць заявіць, што «Ч. З.» «у меншай меры вяла падрыхтоўку да зьезду, чым іншыя газэты», не гаворачы ўжо аб больш глыбокай і дэтальнай ацэнцы.

Па другой частцы артыкулу «Ч. З.» канстатуем, што «Чырвоная Зьмена» апублікавала ліст Цэнтральнага Камітэту КП(б)Б **СА СПАЗЬНЕНЬНЕМ НА 2 ДНІ...**

Больш спрачацца з мужнымі абаронцамі «гонару мундзіру» з «Чырвонай Зьмены» ня будзем. Мы хочам толькі патрэбным яшчэ адзначыць адсім недапушчальны тон учарашняга артыкулу «Чырвонай Зьмены».

Абурэньне «Ч. З.» варта лепшай выкарыстаньня. Куды лепш было-б калі-б «Чырвоная Зьмена» замест бездаказных разважаньняў аб необходнасьці «супакоіць аўтара агляду», аб «20 проц. праўды ў аглядах «Зьвязды» і г. д., — аддавала больш увагі практычнай рэалізацыі пастановы рабселькораў беларускага зьезду рабсельвасенкораў.

Менская гарадзкая канфэрэнцыя ўдарнікаў

Увечары 26 ліпеня на Менскай гарадзкой канфэрэнцыі ўдарнікаў працягваліся спрэчкі па дакладу старшыні ВСНГ тав. **Грысэвіча** аб выніках выкананьня прамфінпляну за першае паўгодзьдзе.

У спрэчках выказалася больш 13 дэлегатаў. Усе выступаўшыя ў сваіх прамовах шмат спыняліся на гістарычнай прамове тав. Сталіна, якая паказвае кожнаму прадпрыемству, гаспадарчаму кіраўніцтву, кожнаму ўдарніку канкрэтныя шляхі, пры дапамозе якіх можна па-бальшавіцку перамагчы дапушчаныя прарывы ў выкананьні прамфінпляну.

Тав. **Эдэльман** з фабрыкі «Кастрычнік» гаворыць, што ў сувязі з пераводам цэхаў на гаспадарчы разрахунак, значна ўзьвялася прадукцыйнасьць працы, больш ударнымі тэмпамі пачаліся ліквідацыя дапушчанага прарыву заводзкага прамфінпляну. Зараз мы стаім пытаньне аб пераводзе на гаспадарчы разрахунак ня толькі цэхаў і агрэгатаў, але і асобных брыгад.

Тав. **Розін,** рабочы заводу «Камунар», гаворачы аб дапушчаным на заводзе прарыве ў выкананьні прамфінпляну за першае паўгодзьдзе, упэўнена заяўляе:

— Прамова тав. Сталіна паспужыла асноваў ня толькі для замацаваньня посьпехаў, якіх мы дасягнулі за чэрвень месяц у сувязі з абвяшчэньнем месячніка штурму, яна вызначае шляхі далейшага разгортваньня небачаных ударных тэмпаў работы.

У часе працяцоўкі прамовы тав. Сталіна па цэхах, з боку рабочых паступілі дзесяткі каштоўных прапаноў, пры ажыцьцяўленьні якіх мы зможам дабіцца яшчэ большых ня-бачных паказальнікаў работы.

Па ўсіх асноўных пытаньнях гістарычнай прамовы тав. Сталіна мы прынялі і ажыцьцяўляем рад важнейшых пунктаў.

Мы заключылі дагавор з падшэфным калгасам аб забесьпячэньні нашага прадпрыемства рабочай сілай. Мы паставілі пытаньне аб пераводзе ўсіх брыгад, якія працуюць на масавай рабоце, на прагрэсыўна-зьдзельную аплату работы. Ужо пераведзены абрубшчыкі, брыгада сьлесарнага варштату і г. д. Зьнішчана ўраўнілаўка ў тых рабочых камунах, дзе яна перашкаджала ў рабоце.

Распачата работа па пераводзе цэхаў на гаспадарчы разрахунак шляхам заключэньня дагавароў ня паміж цэхамі, таксама і паміж паасобнымі аддзеламі заводакіраўніцтва. Будзе скончана да гэтага часу работа па пераводзе ўсіх брыгад на гаспадарчы разрахунак.

Для паляпшэньня бытавых умоў рабочых вядуцца работы па пабудове ім для 105 сем'яў рабочых нашага заводу. Прымацаваньне да нашага заводу жакту № 8 таксама дасьць магчымасьць палепшыць становішча рабочых у гэтым напрамку.

У мэтах сапраўднага ажыцьцяўленьня лёзунгу тав. Сталіна аб аўладаньні кожным рабочым тэхнікай, при заводзе арганізуецца школа-тэхнікум, якой мяркуецца ахапіць большасьць рабочых заводу.

Правядзеньне ўсіх гэтых мерапрыемстваў дасьць магчымасьць нашаму заводу па-бальшавіцку выканаць і перавыканаць прамфінплян трэцяга раўнчатага году пяцігодкі ў найкарацейшы тэрмін.

Далей тав. Розін зачытаў сьпіс аб нарадчы ў партыю, у сувязі з прамовай нашага правадыра тав. Сталіна, 20 лепшых рабочых-ударнікаў—барацьбітоў за прамфінплян.

Вечарам 27-га ліпеня працягваліся спрэчкі па дакладу тав. Грысэвіча.

АПАЛ—РАБОЧЫМ ЦЭНТРАМ

ДЫРЭКТЫВЫ ПАРТЫІ

аб загатоўках лесаматар'ялаў і дроў большасьцю лесапрамгасаў ня выконваюцца

Прыклады апартуністычнай бязьдзейнасьці паказваюць Рэчыцкі, Глускі, Бабруйскі, Асіпавіцкі, Чэрвеньскі, Хойніцкі і Менскі леспрамгасы

Праведзены з 15 чэрвеня па 15 ліпеня месячнік лесазагатовак абсалютна НІЯКАГА ПЕРАЛОМУ Ў ВЫКАНАНЬНІ ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫХ ПЛЯНАЎ НЕ ЗРАБІЎ.

У пераважнай большасьці раёнаў і леспрамгасаў у выніку апартуністычнай недаацэнкі мясцовымі партыйнымі, камсамольскімі, прафсаюзнымі і іншымі арганізацыямі справы лесазагатовак, МЕСЯЧНІК ГАНЕБНА ПРАВАЛЕН (Старобін, Лельчыцы, Чэрвень, Пасталы, Бярэзіна і інш.).

СТАНОВІШЧА З ЗАГАТОЎКАМІ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ І АСАБЛІВА ДРОЎ ПА РАНЕЙШАМУ ЗАСТАЕЦЦА ПАГРАЖАЮЧЫМ.

Паводле даных Лесбелу, гадавое заданьне па загатоўках дроў на 21 ліпеня выканана НА 27,2 ПРОЦ. Праграма трэцяга кварталу па загатоўках дроў выканана ўсяго толькі НА 15,1 ПРОЦ.

Пляны вывазкі загатоўленых дроў на пункты адпраўленьня таксама ПАД ПАГРОЗАЙ ЗРЫВУ.

Гадавое заданьне па вывазцы выканана на 40,8 ПРОЦ., а квартальнае — толькі НА 12,0 ПРОЦ.

Рад леспрамгасаў, як паказвае зводка Лесбелу, проста ЗРЫВАЮЦЬ ВЫКАНАНЬНЕ ВЫЗНАЧАНЫХ УРАДАМ ГАДАВЫХ ПЛЯНАЎ ЛЕСАЗАГАТОВАК, ГАНЕБНА ІГНАРУЮЦЬ І НЯ ВЫКОНВАЮЦЬ ШМАТЛІКІХ ПАСТАНОЎ ЦК КП(б)Б, ЯКІ ДАЎ РАШУЧУЮ ДЫРЭКТЫВУ ЎСІМ ПАРТЫЙНЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ, УСІМ ПРАФСАЮЗНЫМ І САВЕЦКІМ МЯСЦОВЫМ ОРГАНАМ АБ ЗАБЕСЬПЯЧЭНЬНІ 100 ПРОЦ. ВЫКАНАНЬНЯ ЦАЛКАМ І Ў ТЭРМІН ВЫЗНАЧАНЫХ ПРАГРАМ ЗАГАТОВАК.

Так, Асіпавіцкі леспрамгас замест 415 ТЫС. КБМ. загатовіў на 21 ліпеня толькі 13.701 КБМ., што складае 17,2 ПРОЦ. ПЛЯНУ.

Глускі замест 409.455 КБМ. даў 42.126 КБМ., выканаўшы плян на 10,3 ПРОЦ.

Бабруйскі леспрамгас загатовіў 62.511 КБМ., замест вызначаных паводле пляну 403.989 КБМ., выканаўшы, такім чынам, гадавы плян на 15,5 ПРОЦ.

Ганебна цягнуцца ў хвосьце як па загатоўках, так і па вывазцы: ТУРАЎСКІ, ЛЕПЕЛЬСКІ, МЕНСКІ, БОРКАВІЦКІ, БАРЫСАЎСКІ і інш.

Усе гэтыя факты гавораць аб ЯЎНА НЕЗДАВАЛЬНЯЮЧЫХ ТЭМПАХ РАБОТЫ НА АДНЫМ З АДКАЗНЕЙШЫХ ВУЧАСТКАЎ САЦЫЯЛІСТЫЧНАГА БУДАЎНІЦТВА—НА ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫМ ФРОНЦЕ.

Гэта можна тлумачыць выключна тым, што мясцовыя партыйныя арганізацыі, камсамол, прафсаюзы, ня выконваюць важнейшых пастаноў партыі і ўраду аб забесьпячэньні нашай прамысловасьці лесаматар'ялам і рабочым цэнтрам апалам.

Ня гледзячы на шматлікія сыгналы цэнтральнага друку і ў прыватнасьці ЦО КП(б)Б «Зьвязды» аб зрыве лесазагатовак, НА МЯСЦОХ ПЕРАЛОМУ ЎСЁ ЯШЧЭ НЯМА.

Гэта патрабуе безадкладнага ўмяшаньня органаў РСІ, якія павінны знайсьці канкрэтных носьбітаў эпа, па віне якіх у першую чаргу ЗРЫВАЮЦЦА ПЛЯНЫ ЛЕСАЗАГАТОВАК, І ПРЫцягнуць іх да суровай адказнасьці.

ЁСЬЦЬ УСЁ МАГЧЫМАСЬЦІ ВЫЗНАЧАНЫЯ ПЛЯНЫ ПА ЗАГАТОЎКАМ ЛЕСАМАТАР'ЯЛАЎ І ДРОЎ ВЫКАНАЦЬ. ПАТРЭБНА ТОЛЬКІ Ў ГЭТЫМ ПЫТАНЬНІ БАЛЬШАВІЦКАЯ НАСТОЙЛІВАСЬЦЬ, АПЭРАЦЫЯНАЛЬНАСЬЦЬ І УПАРТАСЬЦЬ, БАЯВОЕ АЖЫЦЬЦЯЛЕНЬНЕ ВЫЗНАЧАНЫХ МЕРАПРЫЕМСТВАЎ ПАРТЫІ І ЎРАДУ, ЯКІЯ ПАКАЗАЛІСЬ ЗАБЯСЬПЕЧВАЮЦЬ ПАСЬПЯХОВАЕ ВЫКАНАНЬНЕ ПРАГРАМ ЛЕСАЗАГАТОВАК.

ПАТРЭБНА НЕАДКЛАДНА ВА ЎСІХ ЛЕСПРАМГАСАХ, НА ЎСІХ ЛЕСАЗАГАТОЎЧЫХ ПРАЦАВАЦЬ ПРАМОВУ ТАВ. СТАЛІНА, ЯКАЯ ДАПАМОЖА МЯСЦОВЫМ АРГАНІЗАЦЫЯМ ПЕРАКЛЮЧЫЦЬ УСЮ РАБОТУ НА ЛЕСАЗАГАТОВЧЫХ ВУЧАСТКАХ САПРАЎДЫ НА БАЯВЫЯ ЎДАРНЫЯ ТЭМПЫ РАБОТЫ.

Адказны рэдактар С. БУДЗІНСКІ

„ЧЫРВОНАЯ ЗОРКА" — Першая гукавая мастацкая карціна **Пуцёўка ў жыцьцё** Драма ў 34 эпізодах
„КУЛЬТУРА" Пач. у 7; 8-45; 10-30 — **Новая вялікая мастацкая СТАНЦЫЯ ПУТНІ.**
Інтэрнацыянал Пач. у 7 г. веч. — **КІНІЖНА МЭРЫ** Звыш прагр.—кіно-нарыс БДК Ударны рэйд.
„Пралетары" Адкр. з 12 г. дня. — 2 сеансы, 18 част. у адным сэансе **СТЕНЛЕЙ** у нетрах Афрыкі.
„ЮНЫ ПІЯНЭР". Гэтымі дванц. у памяшканьні кіно „Культура" адбудзецца адкрыцьцё кіно „ЮНЫ ПІЯНЭР" **рачоце за рэклямай.**
„СПАРТАК" Пач. у 7, 9. і 11. Каса—з 5 гадз. — Замежны фільм **ЧАЛАВЕК, ЯКІ СЬМЯЕЦЦА** ў 10 частках

Віцебскі Ветэрынарны навучальны камбінат АБВЯШЧАЕ ПРЫЁМ на першы курс ветінстытуту на дзённае аддзяленьне ў ліку 60 асоб, 250 асоб завочнікаў і на першы курс ветэхнікуму 102 асобы. Правілы прыёму абвешчаны ў дакладзе Наркамасьветы на 1930-31 навучальны год. Прыём заяў ад жадаючых паступіць як у ветінстытут, так і ветэхнікум будзе працягвацца да 15 жніўня, з якога часу пачынаюцца іспыты для асоб, якія ня маюць вялікай адукацыі. Пачатак заняткаў 1-га верасьня. Заявы накіроўваць на адрасу Віцебск, Ветінстытут. Дырэкцыя інстытуту.

Менская кантора „САЮЗТРАНСУ" паведамляе ўсіх адпраўшчыкаў грузаў, што з